Ба 8451

Я. Колас.

Вайна вайне.

V20 46/0 Бо 8308

Якуб Колас

ВАЙНА ВАЙНЕ

ДРАМА
у IV ДЗЕЯХ



ДВБ ★ МЕНСК
1 9 3 8

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна

Ба 8451
OzSSR-DXK
38 г. 888
ГПБ УзССР

ЯКУБ КОЛАС

ВАЙНА ВАЙНЕ

ДРАМА Ў IV АКТАХ

Мнв. 1958 г Ба 8451
Бел. аддзел
1984 г.
М20 46/0
ГПБ Уз.
Дзяржаўнай бібліятэкі

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
МЕНСК МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА 1938

ПРЫМАЮЦЬ УДЗЕЛ:

Дзед **Мікіта**,—селянін гадоў за 60.
Бабка **Тацяна**,—яго жонка.
Міхась,—сын дзеда Мікіты, салдат запаса.
Наста,—жонка Міхася.
Гараська,—сын Міхася, хлопчык гадоў 9.
Алесь,—вясковы настаўнік, кватарант дзеда Мікіты.
Марына,—настаўніца гадоў 20.
Аслаў,—сусед дзеда Мікіты і прыяцель. Заіка.
Думака Патап, шахцёр,—прыяцель Алеся.

Дзяменя Дзям'ян,—бабыль. **Дроб Паўлюк**. **Гузыр Андрэй**.	Запасныя.

Тэкля,—вясковая кабета.
Караліна,—дурная жанчына.
Стараста,—селянін гадоў пад 40.
Поп.
Бухрай,—заможны селянін.
Максім Кучаравы —большэвік-падпольшчык.
Шышла,—паліцэйскі ўраднік.
Будан-Рыльскі,—земскі начальнік, афіцэр запаса.
Жухін,—афіцэр-ліберал.
Афіцэр-дваранін.
Афіцэр-кадравік.
Сястра міласэрдная.
Дзесяцкія, салдаты, афіцэры, матросы, сяляне, сялянкі.

---

25. 6. 4. 2009

АКТ I

Дзея адбываецца ў вёсцы; перад падняццем заслоны жаночы хор спявае жніўную песню. Падымаецца заслона. У полі чуваць далёкая ціхая песня. Калі жніўная песня даносіцца цішэй, пачынаецца дыялаг паміж **Алесем** і **Марынай**.

Сярэдзіна лета. Вясковая вуліца. Адным канцом упіраецца ў пясчаны бераг рэчкі. На беразе дзе-ні-дзе стаяць нахіленыя вербы. Недалёка ад рэчкі стаіць хата дзеда Мікіты. Насупроць хата Аслава. **Аслаў** папраўляе сець. Дзед **Мікіта** клепле касу. Берагам ідуць **Марына** і **Алесь**, гутараць, прыслухоўваючыся да ціхай далёкай песні.

I

Я малада з поля ішла,
Пад поясам сярпок нясла,
За плячыма калысачку.
Сустрэў мяне родны татка.
— Чыё, донька, дзіця нясеш?
— Нясу дзіця суседскае.
— Чаму, донька, тваё ліцо?
— Мой татачка, мой родненькі!
Яно пры мне раджалася,
Яно пры мне гадавалася,
А ў маё ліцо ўдавалася.

II

Ды я жала да вечара,
Ды жала я да вечара.
Баліць мая сярэдзіна.
Каб я мела дзіцятачка,
Каб у мяне маленькае,
Можа-б яно заплакала,
Дык я-б яго скалыхнула,
Сярэдзіна-б адпачнула.

Алесь *(запыняецца)*. Вось ты зірні, Марынка, якая спакойная, якая ціхая гэтая сельская ваколіца і колькі ў ёй смутку і, ведаеш, нейкага тужлівага задумення.

Марына. Ты, здаецца, упадаеш у лірычны настрой.

Алесь. Не, я проста хачу адзначыць, што гэты спакой фальшывы.

Марына. Не зусім ясна для мяне твая думка.

Алесь. Да я-ж і не выказаў яе да канца. Слухай, і ты пачуеш вялікую праўду.

Марына. Калі ты скажаш вялікую праўду, дык я абвяшчу цябе пракорам і першая пайду за табою.

Алесь *(хітра)*. Памажы-ж мне, божа, сказаць вялікую праўду... Не, я лепей запішу яе наўперад у сваю кніжку. *(Дастае запісную кніжку, піша.)*

Марына. Ну, пакажы. *(Марына заглядае ў запіс. Алесь хавае, не паказвае.)*

Алесь. Не, не пакажу: а раптам ты скажаш, што гэта не такая праўда, каб абвяшчаць мяне пракорам. Не, не.

Марына. Ну, пакажы.

Алесь. Не, не: не хачу рызыкаваць.

(Смяюцца, праходзяць.)

Аслаў *(да дзеда Мікіты, ківаючы галавой у іх бок, заікаючыся).* Ш-ш-шпацыруюць настаўнік і настаўніца.

Дзед Мікіта. А што ім рабіць, чуй, дурань-браце. Маладыя.

(На вуліцы паказваецца жанчына з сярпом, перавязаным анучкаю, і са збанком на восілцы ў руках. Ідзе борзда, спяшаецца. Аслаў расстаўляе рукі, як-бы хоча злавіць яе, перагароджвае дарогу.)

Аслаў *(расставіўшы рукі, заікаючыся).* І-і-і не пушчу. *(Тэкля кідаецца ў другі бок, каб абыйсці Аслава. Аслаў зноў пераймае.)* Сказаў—н-не ппушчу, і-і-нне ппушчу.

Тэкля *(не прымаючы жартаў).* Ды кінь. Няма калі жартаваць!

Аслаў. Не, нне ппушчу!.. Ччаму ты нне сказала мне „дзень добры?"

Тэкля. Да адвяжыся-ж ты, слата. Стары чалавек, а робіць чорт ведае што.

Аслаў. Вось-жа і-і-і нне адвяжуся. Чаму-ж нне сказала „дзень добры?"

Тэкля. Ну, дзень добры, няхай ты недажджы.

Аслаў *(не апускаючы рук).* А-а-а цяпер ужо позна... Сскажы, куды ідзеш? *(Тэкля злосна плюе, парываецца ў другі бок. Аслаў загараджвае дарогу.)* Б-б-брэшаш, Тэкля, і-і-і нне ппушчу!

Тэкля *(злосна).* А бадай табе, Аслаўка, вочы загарадзіла, як загарадзіў ты мне дарогу. Вось вар'ят чалавек, зусім ужо здзяцінеў.

Аслаў. Сскажы, куды ідзеш, тады ппушчу.

Тэкля. Аслаўка, родненькі! Пусці-ж ты мяне—не да жартаў мне: жыта асыпаецца на полі. І так выбралася позна.

Аслаў *(апускае рукі).* Ччаму-ж ты адразу так не сказала? А то і сабе ччас зводзіць і ад мяне адбірае... Ну, ідзі сабе. *(Тэкля борзда ідзе далей.)*

Дзед Мікіта. Ха-ха-ха! Чуй, дурань-браце: стары ўжо ты чалавек, а ўсё дзівацтва не кідаеш. Ха-ха-ха! Жанчына ледзь са скуры не выскачыць, на поле бяжыць, а ён запыняе.

Аслаў. А хто-ж іх і розуму навучыць, калі не я?.. Ты, вось, глядзі, Мікіта: замест таго, каб ісці проста і зразу сказаць, куды ідзе, яна пачынае блытацца, перашкоды абмінуць хоча.

Дзед Мікіта. Да як-жа ёй, чуй, дурань-браце, і не абмінаць, калі на дарозе вось такі пень стаіць.

Аслаў. А ты ўмей цераз пень пераскочыць латвей.

(Уваходзіць Патап. Ён коціць кола.)

Патап. Дзень добры, дзядзькі!

Дзед Мікіта і Аслаў. Дзень добры, Патапе, дзень добры!

Патап *(да Аслава)*. Дык, дзядзька, усё вучыш?

Аслаў *(рашуча)*. А і вучу! Вось ты скажы, колькі разоў ляжа іголка ад Мозыра да Слуцка?

Патап. Закавыкі твае я ведаю, а ты скажы мне лепш, дзядзька Аслаў, чаму адны працуюць, а жывуць у бядзе і нэндзе? Другія-ж нічога не робяць і жывуць у раскошы. Нашто поп і паліцэйскі стражнік?

Дзед Мікіта *(да Аслава)*. Ну, чуй, дурань-браце, растлумач.

Аслаў. Мудра запытаў, мудра. Не быў-бы то Думака-шахцёр.

Дзед Мікіта. А што, Аслаў, чуй, дурань-браце, папаўся!

Аслаў *(да Патапа)*. Падумаць трэба, сынку. Глуздом паварушыць.

Патап. Падумай, дзядзька, падумай, да толькі не кажы, што гэта я пытаў, бо за такія размовы мяне ўжо з шахты патурылі.

Аслаў *(да дзеда Мікіты)*. Запытаў, злодзей! Моцна запытаў!

(З глыбі сяла даносіцца дзілінькание званка. Дзед Мікіта паварочвае галаву, слухае.)

Дзед Мікіта *(у голасе непакой)*. А што гэта, чуй, дурань-браце, за званок там? З валасці едуць, ці што?

Аслаў. А мабыць ужо нейкае ліха вязуць, няхай яны зубамі звоняць. *(Разважае.)* Гм! Навошта поп і паліцэйскі стражнік? Як на добры лад, то яны і не патрэбны.

(На вуліцы замецен рух. Замітусіліся людзі. З іх чарады аддзяляецца ўнук дзеда Мікіты, Гараська бяжыць узбуджаны, устрывожаны.)

Гараська *(запыхаўшыся)*. Прыехаў нейкі пан, ды на пары коней, пад званком... Старасты шукае. „Дзе, кажа, стараста? Дзе стараста?.. Знайсці яго хутчэй“. *(Зноў бяжыць назад.)*

Дзед Мікіта. Хіба пайсці, чуй, дурань-браце, паглядзець. *(Зачыняе акно, выходзіць на вуліцу.)*

(Аслаў стаіць у позе глыбока задуменнага чалавека.)

Аслаў *(сам з сабою)*. „Навошта поп і паліцэйскі стражнік“. Вось, бэстыя шахцёр, куды загнуў.

(Рух на вуліцы павялічваецца. Паказваюцца адзінокія фігуры. Дзесь за сцэнаю крык: *„Бяжы на поле, гані на сход людзей“.*)

Дзед Мікіта *(затрывожаны)*. Навошта сход? Чуй, дурань-браце, хадзем туды.

Аслаў. Гэ, Мікіта: калі што добрае, таго мы не пабачым, не пачуем і не панюхаем. А ліха знойдзе нас само.

(Шум за сцэнаю павялічваецца. Выразна чуваць крык: *„Сымон! Дзесяцкі Сымон Бадыль! Бяжы на званіцу, звані ў пажарны звон“.*)

Дзед Мікіта і Аслаў. Пажарны звон!.. Вось ліха. *(Паварачваюцца адзін да аднаго спінамі, пазіраюць кожны на свой будынак, потым пазіраюць на сяло.)*

Дзед Мікіта. Нічога не відаць.

Аслаў. Ні дыму, ні агню.

Дзед Мікіта. Чуй, дурань-браце, тут штось не так. Склікаць народ пажарным звонам?

Аслаў *(ускідае плячыма)*. Няйначай, як трэба нам пайсці туды бліжэй.

(Збіраюцца ісці, але іх увагу затрымлівае кабета ў лахманах, з клункам за плячыма, з доўгім кіем у руках.)

Дзед Мікіта. А хто гэта там, чуй, дурань-браце, ідзе?

Караліна *(пяе)*:

Калі-ж ты памрэш, дзядочак ты мой?
Калі-ж памрэш, галубчык ты мой?

(Да Аслава і Мікіты.) Дзень добры вам, мужчынкі! Смерць вам нізка кланяецца. Даўно, кажа, чакаю іх у госці.

Дзед Мікіта. Ідзі, ідзі, чуй, дурань-браце. Ідзі, куды ідзеш.

Караліна. Які-ж ты фанабэрысты. А-я-яй.

Мікіта. Да адчапіся ты, Караліна.

(Караліна праходзіць далей. Чуваць звон глухі, надтрэсвуты. Голас яго дужа нагадвае словы: *„гвалт, гвалт“*.)

Дзед Мікіта *(перапалоханы)*. О, божа твая воля! Што-ж гэта ёсць такога? У звон пажарны зазванілі. Даўно яго не чулі мае вушы.

Аслаў. А ведаеш, Мікіта, напэўна лес княжыцкі гарыць.

Дзед Мікіта. О, даў-бы гэта бог, каб толькі таго ліха. Абы не нас яно кранула, чуй, дурань-браце.

(Шум, трывога нарастаюць. Збягаецца народ, устрывожаны, ніхто нічога не ведае. Зноў, як мага, бяжыць *Гараська*.)

Гараська. Дзядок, сам земскі пад званком прыехаў!

Дзед Мікіта. Вось ліха!

(За сцэнаю голас старасты: *„На сход, на сход! Усіх гані на сход. Збірацца каля хаты дзеда Мікіты“*. Сходзяцца мужчыны, жанкі, дзеці. Усе перапалоханы, растрывожаны. Каля хаты дзеда Мікіты збіраецца натоўп. З натоўпу відаць папова галава ў капелюшы. Праз натоўп праціскаецца стараста, за ім земскі начальнік *Будан-Рыльскі*, паліцэйскі стражнік *Шышла* і дзесяцкія з палкамі. *Будан-Рыльскі* ўзлазіць на калодку. Народ замаўкае. Паказваецца *Караліна*.)

Караліна. Ха-ха-ха! Кажуць бо пажар. А тут няма ніякага пажару. Пакідалі на полі работу і выдумалі нейкае вяселле спраўляць... вось дурныя, а бадай...

Шышла. Замаўчы, брыда. *(Б'е яе нагайкаю. Караліна, дзіка азіраючыся, хаваецца.)*

Будан-Рыльскі *(выраз твара важны. Акідае поглядам народ. Колькі моманту захоўвае маўчанне.)* Слухайце! *(Вымае паперу, чытае адрывіста, націскаючы на кожнае слова.)* Высочайшее повеление о мобилизации.

Шышла *(крычыць ва ўсё горла)*. Шапкі далоў! Імператарскі указ, да, собственна, да!

(Мужчыны знімаюць шапкі.)

Будан-Рыльскі *(чытае).* Государь император повелеть соизволил привести армию и флот на военное положение. Первым днем мобилизации назначено 12 часов ночи на 17 июля. Во исполнение высочайшего повеления о приведении армии и флота на военное положение:

Нижним чинам запаса с увольнительными билетами, а неимеющим таковых с видом на жительство явиться на сборный пункт уездного воинского начальника в г. Минске на другой день мобилизации в 6 часов утра.

Бабка Тацяна. А што-ж гэта ён, мае любачкі, вычытвае? Якая-ж гэта аблізацыя?

Голас жанчыны. А ліха яе ведае. Век жылі, не чулі.

Будан-Рыльскі. Мабілізацыя азначае вайну. Не ўпершыню нашай праваслаўнай арміі крышыць ворагаў. Мы скрышым іх і цяпер. Запасныя салдаты! Будзьце героямі, і цар-бацька вас не забудзе. Была ўжо раз наша праваслаўная руская армія ў Берліне, яна будзе там ізноў. Дык з богам за святую Русь! Я сам іду на вайну і буду біцца разам з вамі...

Алесь *(ціха, з глыбіні натоўпу).* Не пераскочыўшы не кажы гоп!

Будан-Рыльскі *(у абурэнні).* Хто сказаў гэта?

(Калі Шышла падышоў да Алеся, Патап, каб выгарадзіць яго, гаворыць.)

Патап. Я сказаў.

Будан-Рыльскі. Ты сказаў?

Шышла. Ён брэша, гаспадзін земскі начальнік. Гэта адсюль хтосьці сказаў.

Будан-Рыльскі. Ураднік! Высніць гэта і далажыць мне! *(Аглядваючы натоўп.)* Мы яшчэ пагаворым з вамі. *(У натоўпе гул нездаволення.)*

(Шышла накідаецца на Патапа, замахваецца біць яго.)

Патап Думака *(ціха, таксама з пагрозай).* Пагаворым на вайне.

Будан-Рыльскі *(не заўважае, да старасты).* Вось якія ягадкі тут водзяцца. А ты, стараста, калі не ў часе і не ўсе збяруцца запасныя, будзеш, як гаворыцца, несці адказ па законах ваеннага часу.

Шышла. Да, собственна, да. Палажэнне не церпіць.

(Будан-Рыльскі выходзіць.)

Шышла *(адзін абыходзіць моўчкі ўсіх).* Сітуацыя! Да, собственна, да. *(Падыходзіць да старасты.)*—Стараста, вазьмі на заметку гэтага грубіяна. *(Падыходзіць да Патапа.)*—Ну счасце тваё што вайна.

(Шышла выціскаецца з натоўпу. Праходзячы міма настаўніцы, галантна ёй кланяецца. Некаторы момант магільная цішыня. Народ, прыслушаны грозную весткаю, яшчэ не разабраўшыся ў ёй, пераглядаецца. Месца Будана-Рыльскага займае стараста.)

Стараста. Вы чулі, грамада: усенародна абвешчана збірацца на вайну. Вы чулі, што казаў мне земскі і чым ён пагражаў. Дык вось, браткі запасныя, збірайцеся барджэй, бо сёння-ж усе мусіце быць у валасці.

Патап Думака. Вайна... Ну што-ж, ваяваць, дык ваяваць, але каб ад гэтай вайны не было часам горача ці холадна каму.

1 голас з натоўпу. А з кім вайна?

2 голас. Завошта?

3 голас. З якім там чортам ваяваць?

Стараста *(па-начальніцку)*. Не наша дзела разважаць, з кім ды за што, бо гэта разважанне можа скончыцца вельмі дрэнна.

Наста *(занепакоеная падбягае да Міхася)*. Міхаська, міленькі! І цябе пагоняць на вайну.

Міхась. А што-ж у зубы паглядзяць мне? Не вышлі яшчэ мае гады, далёка да сарака.

Бабка Тацяна *(галосіць)*. А мой-жа ты, сыночак! А мой-жа ты, саколік. На каго-ж ты нас пакідаеш?

Дзед Мікіта. Ціха ты, чуй, дурань-браце! Разгаласілася! Памогуць тут твае прычытанні, як кашаль хваробе.

Бухрай. А земскі начальнік праўду казаў, хлопцы. Трэба ваяваць. Трэба бараніць нашу зямлю раз на яе замахі робяць ворагі.

Гузыр. О, белабілетнікі—ваякі! А чым я здаравейшы за цябе?

Патап. Ды яму і бараніць ёсць што. Гаспадарка—дзякаваць богу.

Бухрай. А ты чаму не прыдбаў гаспадаркі? Хлеба лёгкага шукаеш. Па свеце валочышся, забастоўшчык.

Галасы жанчын. А божа-ж мой, божа. Ды куды-ж вас гоняць? Ды куды-ж вас забіраюць?

Стараста. Сціхніце! Ціха! бацюшка сказаць штось мае.

Поп. Брацце і сёстры! Вялік гасподзь у гневе справядлівым, і міласці яго несць меры і канца... Не зведаны гасподнія пуціны, і не відна нам яго караючая дзясніца. Будзьце-ж цвёрды, надзейцеся на міласць божжу, памятаючы, што і ў кары сваёй—вайна-ж ёсць біч той кары—яўляе нам гасподзь сваю міласць, бо не да канца прагневаўся на нас і не адхіліў яшчэ ад нас ён свайго твара. Хто меч падняў, і згіне ад мяча. Нямецкае войска збіраецца на нашай граніцы, і ў кожны міг агонь вайны гатоў закінуцца і ў нашу дзяржаву. Высока-ж узнііце караючую дзясніцу. З малітваю, з надзеяю святою ідзіце вы на суд гасподзен, бо хто вялік, як ён, наш бог? Памолімся, брацце. *(Падымае вочы на неба.)* Ты ёсць наш бог і творыш ды дзівоты. Яві ты нам міласць абранаму табою памазаніку твайму. *(Глядзіць на Алеся і Патапа.)* Маланкаю і громам паразі яго адступнікаў і супастатаў. Прыхілі вуха да праваслаўнага твайго народу... Разумейце ўсе языцы і пакарайцеся, яко з намі бог.

Жанкі *(плачуць)*. Ох божа наш, божа.

Стараста. Ціха!

Патап. Пацягаў-бы салдацкую лямку, ды падставіў-бы сваю валасатую галаву пад кулі—не тое заспяваў-бы.

Аслаў *(вымае з зубоў люльку, да папа)*. А-а як-жа, ббацюшка, вось гэта пагадзіць: любіце ворагаў сваіх, благаслаўляйце тых, хто вас ненавідзіць, адплачвайце дабром за зробленае зло?

Поп. Аслаў, Аслаў! Ты мала ў цэркаў ходзіш, злы дух спакуснік заблытаў табе розум... Сказаў гасподзь: „Несць болей той любві, яшчэ хто жывот паложыць за другі свая".

Аслаў. Бацюшка! Ты вось яшчэ што скажы: „Навошта... *(заўважае погляд Патапа, стрымліваецца)* паліцэйскі стражнік?"

Стараста. Хлопцы, хлопчыкі! не зводзіць часу—збірайцеся хутчэй. *(Да папа.)* Малебен, бацюшка, адслужыць.

Голас. Трэба памаліцца за наша войска і за цара.

Бухрай *(крычыць)*. Малебен, бацюшка, адслужыць за цара, за хрысталюбівае воінства!

(Народ расходзіцца. Большая частка ідзе ў цэркаў. Чуюцца галасы: *„Ось і дачакаліся ліха"*. *„Эх-хе, прышла пагібель на народ"*. *„Андрэй! Дзям'ян!—збірайцеся—разам пойдзем"*. Застаюцца **Марына, Алесь** і **Патап**.)

Алесь *(пасля паузы, журботна)*. Вось як яно выходзіць, Патап. *(Марына апускае галаву, перабірае пальцамі брыжы шарфіка, маўчыць у засмучэнні.)*

Патап. А як уз'еўся наш ваяка-земскі!

Марына *(падымае вочы на Алеся)*. Ахвота была вам чапаць гэтага салдафона... Ну і задзіры, вы.

Патап *(з горкім жартам)*. Ідучы на вайну трэба-ж набірацца ваяцкасці... Сволач! *(Патап пайшоў.)*

Марына. *(Пауза.)* І ты зараз пойдзеш! Прыдзе вечар і цябе ўжо тут не будзе... І не думала ніколі, што нам так хутка прыдзецца разлучыцца.

Алесь. Разлучыцца надоўга і можа быць... на заўсёды.

Марына. Кінь, Алесь, гэтыя думкі, не гавары гэтага. Можа ты і зусім не пойдзеш на вайну... Ды ты-ж і ў войску не служыў. Няўжо-ж цябе, неабучанага, пашлюць на вайну.

Алесь. Навукі вялікай тут і не трэба: памуштруюць месяц—і салдат.

(Здалёку даносяцца з цэркві спевы малітвы: *„Спасі госпадзі"*.)

Марына *(з болем)*. Якая недарэчнасць, якая дзіч—вайна. Людзі, культурныя людзі дваццатага сталецця не могуць знайсці іншага спосабу, апроч вайны, каб разыйсціся мірна.

Алесь. Калі-б на вайну, пад першыя кулі ішлі тыя, хто вайну ўзнімае і гоніць людское стада на смерць і знішчэнне, то можа вайны і не было-б... *(Здалёку ізноў громка даносіцца „Спасі госпадзі".)* Эх, вайна, вайна, Марынка... Хто

вернецца з яе, калі вернецца, то як. *(Глядзіць у той бок, дзе спяваюць.)*

Марына *(хватае Алеся за руку).* Не гавары ты гэтак. Толькі вярніся. Вярніся, Алесь, мілы мой.

Алесь *(паволі, як-бы выпрабоўваючы Марыну).* А калі вярнуся я... калекаю... без рук, або без ног?

Марына *(узрушана).* Не гавары так... не гавары... Я не хачу.

Голас старасты. Збірайся, выхадзі.

Алесь. Клічуць... Рвуцца апошнія звенні... Марынка, будзешь мяне помніць?

Марына *(горача).* Кожны час, кожны момант. *(Кладзе галаву на плячо Алесю.)*

Голас.—Не зводзьце часу!..

Алесь. Ну, Марыначка, любая мая, прашчай. *(Падае руку, цалуе яе.)*

Марына. Алеська... шануйся. Але ты вернешся. Ты вернешся. Я так хачу!.. Бывай-жа шчаслівенькі, здаровы. Пішы-ж мне, пішы чым найчасцей. *(Бяжыць і знікае.)*

Алесь *(засмучаны праводзіць вачамі).* Так блізка яна і так далёка!.. Бяздонніца кладзецца паміж намі... А хто кладзе і для чаго? *(Апускае галаву, стаіць момант, задумаўшыся.)* Пяройдзена нейкая мяжа... Як гэта дзіўна.

(Ідзе ў хату дзеда Мікіты. Некаторы час сцэна пустая. Здалёку чуваць гармонік. Іграе матыў песні: *„Ах, ты гора"*...)

Жанчына. А куды-ж цябе гоняць?

Хлопец. Куды, куды? вайну нейкую выдумалі!

Жанчына. А на каго-ж ты мяне пакідаеш?

Хлопец. Ты глядзі, Алёна, сына сцеражы, зямлю даглядай.

Жанчына. Без цябе страшна.

Гузыр. Міхась! Міхась. *(У акне паказваецца Міхась.)* Сабраўся ты? Пойдзем разам.

Дроб *(з гармонікам).* Рушым, брат, у кампаніі: людзі пайшлі ўжо.

Міхась. Зараз, брат. Пачакайце трошкі. Чорт яе не забярэ, вайну, а без нас не абыйдзецца. А то зайшлі-б у хату.

Гузыр. Мы тут пачакаем. *(Міхась адыходзіць.)*

Дроб. Давай закурым. Спяшацца вельмі няма куды. Чорт іх там не пабярэ. *(Дастаюць кісеты, закурваюць.)*

Гузыр. Праваліся ты, гэтакае ліха.

Дроб. Агні-б яе спалілі гэтую вайну... Раптам, як з грому ў самы рабочы час...

(Выходзіць **Міхась** з клункам, за ім **Наста**, дзед **Мікіта**. Выбягае бабка **Тацяна**.)

Бабка Тацяна. Дык што-ж гэта мы, як-бы пасварыўшыся. *(Да дзеда Мікіты.)* Бацька! Трэба-ж было-б хоць пасілкавацца на дарогу ды па чарцы выпіць. *(Плача.)* Не ў госці-ж ідуць.

(Выходзіць **Алесь**.)

Дзед Мікіта. І галаву страціў сваю старую. Пастойце, дзеткі, чуй, дурань-браце.

(Варочаецца назад. Усе запыняюцца.)

Міхась. А праўда, хлопцы: адходнага шмаргануць трэба для храбрасці.

Дроб. Ды яно не пашкодзіла-б.

Міхась. Дык зойдзем у хату.

Гузыр. А мы тут, па-паходнаму.

Міхась. Ну, давай тут. Цягні бацькаў варштат. *(Дроб ізноў іграе на гармоніку. Міхась і Гузыр выносяць варштат, на якім майструе дзед Мікіта.)* Такога, брат, стала на пазіцыях не знойдзеш. *(Міхась, Гузыр і Дроб знімаюць клункі, вешаюць іх на плоце. Дзед Мікіта нясе бутэльку, бабка Тацяна—закуску, Наста—абрус. Борзда накрываюць варштат.)* Хоць у ліпені маёўку справім. Падыходзь, хлопцы, бліжэй.

Бабка Тацяна *(плача)*. Забіраюць вас, мае дзетачкі. Ды хто-ж мне вочкі зачыніць! Хто-ж мае костачкі пахавае!

Дзед Мікіта *(налівае чарку, п'е першы. Да Міхася)*. Здароў-жа будзь, сынок. Варочайся шчасліва і хутка дамоў.

(*Чарка пераходзіць з рук у рукі.*)

Міхась *(да Алеся)*. Што, прафесар, зажурыўся? Выпі!

(Алесь бярэ чарку.)

Гузыр. Што журыцца? Журыся, не журыся, а ісці трэба.

Алесь. Дык будзьце здаровы, мужчыны. Няхай журыцца той, хто вайну пачынае, ды зажурыцца так, каб не слязмі, а кроўю заплакаў.

Гузыр. Як яно там будзе, а ісці трэба.

Міхась. І пойдзем! У крыўду не дамося; пакажам немцам, па чым хунт сушанага ліха.

Бабка Тацяна. Няхай-жа вас бог святы бароніць. Варочайцеся здаровенькія.

Міхась *(разыходзіцца)*. А я, брат, не абы што: я гвардзеец. Падвышэнне дадуць. Тады са мной да трох не гавары. *(Падае каманду.)* Рота справа ва ўзводную калону стройся!

Дроб. Камандзір з цябе добры.

Міхась. А што ты думаў. Яшчэ, брат, помню салдацкую службу.

Бабка Тацяна *(выцірае слёзы)*. Вось гэтыя мужчыны— і вайна іх не пужае. Усё гатовы забыць, са ўсяго жартаваць.

Дзед Мікіта. Ох, божа, божа! Адзін ты Мікіта, чуй, дурань-браце, застаешся.

Жанчына. А, сыночак ты мой міленькі, дубочак зялёненькі. Пакідаеш мяне адну, як былінку ў полі. Ды на полі больш цябе не пабачу, ды ніколі больш цябе не пачую.

Я е с ы н. Не трэба, мамка!

Д з е д М і к і т а *(гаротна)*. Ох, божа, божа!

(На вуліцы яшчэ праходзяць запасныя з клункамі, іх праваджаюць жанкі і дзеці.

М і х а с ь *(Дробу, не стрымаўшы нахлынуўшай тугі)*. А ну, Паўлюк, заіграй ты на дарогу так, каб аж сам чорт нам пазайздросціў.

Г у з ы р. Пакажы сябе, Паўлюк!

(Паўлюк бярэ гармонік, пачынае вясёлую, заліхвацкую штуку. Усе заціхаюць. Міхась і яго таварышы ў такт музыцы ўскідваюць плечы, ківаюць галовамі, пераглядаюцца. Міхась тупае нагою, пускаецца ў прысядкі. Танец яго жудасны, знадворнай вясёласцю прыхоўвае вялікае, усё болей нарастаючае гора.)

Д р о б. Валі, валі, Міхась!

А л е с ь. Малайчына, Міхась!

(Міхась, Гузыр, Дроб танцуюць Лявоніху, да іх далучаецца яшчэ некалькі.)

Ж о н к а Г у з ы р а *(кідаецца да яго, хапае яго за адзежу)*.

А як-жа ж я без цябе жыць буду.
А хто-ж цяпер нас прыгрэе,
А хто-ж нас прыгарне,
А хто-ж нас пракорміць гаротных,
А хто-ж нашу гаспадарку даглядзіць,
А божа-ж наш, міласэрдны божа.
А за што-ж пакараў ты нас бедных.

Г у з ы р. Пакараў!.. сціхні ты! Годзе табе скавытаць! *(Плешча ў ладкі, падпявае.)*

Заграслася наша хата,
Выпраўляючы салдата.
Тут галосяць і спяваюць
Разам хрысцяць і хаваюць.
Ідзі, салдат, на вайну
У чужую старану!
Ты не будзеш там араці—
Стрэльба будзе твая маці.
Стрэльба—жонка, стрэльба—цешча
Ды яна-ж цябе прыплешча.
Ідзі-ж, салдат, ваяваць,
Лоб пад кулі падстаўляць.

песні ўсім робіцца жудасна. Бабка Тацяна, Наста не выцерпелі і плачуць. Праходзіць яшчэ грамада запасных і стараста.)

С т а р а с т а *(стукае кіем у вароты)*. Хлопцы, хлопчыкі! у дарогу! Пара, браткі!

Запасныя *(з вуліцы)*. Гэй, пойдзем разам.

(Музыка абрываецца.)

Д р о б *(складае гармонік)*. Збіраймася, браткі! *(Збіраюць клункі, прашчаюцца. Міхась цалуе бацьку і матцы рукі.)*

М і х а с ь *(бярэ Гараську, высока падымае, цалуе)*. Расці, сынок, вось гэтакі. Памагай дзеду гаспадарыць, матку шануй і будзь добрым хлопцам.

А л е с ь. Ну, дзядзька Мікіта, бывайце.

Д з е д М і к і т а. Бывай, саколік. Ні бацька, ні маці не праводзяць цябе, чуй, дурань-браце!

Г а л а с ы ж а н о к *(плачуць)*. Да куды-ж вас гоняць? Да як-жа мы тут жыць будзем?

Г а л а с ы. Бывайце здаровы! Прашчайце! Шчасліва і скора вярнуцца.

(Некалькі галасоў зацягнула: *„Последний нонешний денечек“*, але песню перапынілі галасы жанчын.)

Ж а н ч ы н а. А братачка, родненькі, а галубочак сізанькі, а як-жа я адна сіроцінка застаюся?

С е л я н і н. Трымайся, трымайся, сястрычка. Вайна скончыцца, вярнуся жывы і здаровы.

Д з я ў ч ы н а *(дае падарунак)*. Вазьмі... вышыла. Глядзі не забудзься на мяне...

Х л о п е ц. Я не забуду, ты толькі не забудзь, чакай мяне і не гуляй ні з кім. Вярнуся, вазьму цябе, а калі пачую што якое пра цябе, дык глядзі!

Д з я ў ч ы н а. Ляксей, мой родненькі! Ды што ты—дык каб я што якое—варочайся хутчэй толькі.

Ж а н ч ы н а. А Міколачка, братачка родненькі. Няма ў мяне ні маткі, ні бацькі і цябе гоняць у чорную старонку. А хто-ж цябе дагледзіць? Хто-ж табе кашульку памые?

З а п а с н ы. Бывай, сястрыца, родная, не сумуй.

(На вуліцы чуваць песня: *„Последний нонешний денечек“*. Запасныя выходзяць. **Наста** з малым на руках, учяўшыся за **Міхасёву** руку, вісне на яго руцэ, замлявае. Працэсія аддаляецца, шум заціхае, моўкне. Каля хаты стаіць дзед **Мікіта, Аслаў**, панура звесіўшы галовы. Трохі далей—стараста, глядзіць услед знікшых запасных. Ззаду **Дзяменя**, крыху падвыпіўшы, спявае: *„Соловей, соловей пташечка! Канареечка жалобно поет!“* **Дзяменя** ўваходзіць адзін.)

С т а р а с т а. Ты што цягнешся, як кішка?

Д з я м е н я. Без строгасці, стараста. Лягчэй, ты цяпер мне не гаспадар. Я—казённы чалавек, салдат. Што ёсць салдат? Абаронец веры, цара і айчыны. А калі Дзяменя возьмецца за што, дык ну!

С т а р а я ж а н ч ы н а. А сыночак мой міленькі, а я-ж цябе насіла, гадавала, гаравала.

Я е с ы н. Кінь, кінь, матуля, галасіць, слёзы не памогуць. Слязмі вайну не адхіліць, збожжа трэба з поля збіраць, а то асыпаецца.

Ж а н ч ы н а. Ой, Трахімка, а хто-ж мне памагаць будзе. А хто-ж мяне карміць будзе. Каб не гэта чорная хмара, свяціла-б нам яснае сонейка.

Я е с ы н. Супакойся, супакойся, матуля. Вернемся з вайны, немца разаб'ем.

(Жанчына млее.)

С т а р а с т а *(да Патапа)*. Ну, ты, грубіян! Чаго марудзіш.

Патап. А ты, стараста, запішы: вера—папу мера, цар—па баку жар. Айчына—авечая аўчына... Дарогу рабочаму шахцёру.

Дзяменя. І парабку-бабылю! *(Іграе гармонік.)*

(**Народ ідзе групамі. Усе пяюць:** *„Последний нонешний денечек“*, **жанчыны плачуць.**)

Гараська *(да дзеда Мікіты).* Ох, дзядок, і многа-ж народу паваліла з сяла. І тата пайшоў, і настаўнік наш!

Дзед Мікіта *(моўчкі кладзе руку на Гараськаву галаву, пазірае на Аслава. Моўчкі трасуць галовамі).* Так, чуй, дурань-браце, застаўся лом адзін—калекі нядошлыя, старыя!.. *(Уздыхае.)* Эхе-хе! Пабралі нашых саколікаў, пагналі... Куды? Чаго? На што?

(Стаяць моўчкі, апусціўшы галовы. **Гараська** туліцца да **Мікіты**. **Настаўніца** сядзіць з дзецьмі, усё болей і болей аддаляецца песня: *„Последний нонешний денечек“*.)

Заслона

АКТ II

Другі акт пачынаецца песняй:

Гнуцца лозы над крыніцай
 Ды шумяць тужліва.
Ідзе гора з маладзіцай
 У поле на жніва.

Прыпеўка: Зачыніла свет вайна,
А я з дзеткамі адна,
З дробнымі, малымі,
Цяжка адной з імі.

Вее вецер па-над борам,
 Ходзячы па свеце.
Ой, вы, сонца, месяц, зоры,
 Праўду мне скажыце:
Дзе мой горкі бедачына,
 Мой салдат пахілы.
Без яго мне, сіраціне,
 Белы свет не мілы.

Прыпеўка: Зачыніла свет вайна,
А я з дзеткамі адна,
З дробнымі, малымі,
Цяжка адной з імі.

Ці жывы ён, ці забіты,
 Ці ў чужым палоне.
Шапаціць мне штосьці жыта,
 Ды слоў не гамоніць.
У каго-ж я запытаю—
 Нема ўсё навокал:
Дзе ты, дзе, у якім краю
 Мой нявольнік-сокал.

Прыпеўка: Зачыніла свет вайна,
А я з дзеткамі адна.
Горка мне адненькай,
Сумна маладзенькай.

КАРЦІНА 1-ая

ПАЧАТАК ВОСЕНІ 1915 ГОДА

Заслона адкрываецца ў цемнаце ў часе песні *„Гнуцца лозы“*. Пасля канца песні даецца святло на сцэну. Дзея адбываецца ў той-жа вёсцы, каля школы. Шчыток школьнага даху абапіраецца на круглыя набеленыя слупы ганку. Ганак прадстаўляе сабою невялікую адкрытую веранду. Па адзін і па другі бок веранды пярылы. Паўздоўж пярыл простыя драўляныя лаўкі. Каля аднае з іх стаіць стол. На стале газеты, чарнільніца. Перад школаю даволі прасторны двор. У канцы двара пералаз. У веснічкі з вуліцы на двор школы прасоўваецца поп. Павольна сунецца на ганак школы. Узыходзіць на веранду, бярэцца за ручку дзвярэй, штурхае. Дзверы не адчыняюцца. Стукае, ніхто не адклікаецца.

П о п *(сам сабе, нездаволена).* Не можа быць, каб спала да гэтага часу. Вышла куды, ці дома зусім няма? (*Са злосцю.)* А можа зачынілася з кім? *(Топчацца на ганку, падыходзіць да стала, чытае загало кі газет.)* „Русские ведомости“. Лібералка! А газет, рэкам ў е а н ых начальствам, не чытае.

(Круціць галавою, дакорліва.) Вольнадумствам заражана. Дабром гэта ніколі не канчаецца... Эх, народ, народ! Пагібелі сабе шукае.

(На пералазе паказваецца Шышла з кветкамі. Ідзе ў школу. Заўважае папа, запыняецца. Бярэ па-ваеннаму пад казырок.)

Шышла. Здрастуйце, айцец Кандраці.

Поп. А, гаспадзін Шышла! Маё шанаванне! І вы сюды? А яе і дома няма.

Шышла *(збянтэжана)*. Вы, бацюшка, да, собственна, да, таксама па справе?

Поп *(хітра)*. Ой, хітрэц які, Арцём Іванавіч! А калі-б і без справы, ну скажам, як і вы? Не аднаму-ж толькі вам, Арцём Іванавіч, падзяляць прыемнасць кампаніі Марыны Мікалаеўны. А я хіба не маю на гэта права?

Шышла *(ускідвае плячыма)*. Яно, як сказаць, да, собственна, да. Крыху перашкаджае духоўны сан, ну... і матушка. А падругое, адкуль вы ўзялі, што ў мяне справы няма?

Поп *(смяецца, стукае Шышлу па плячы)*. Жартую, Арцём Іванавіч. *(Мяняе тон ціха, сур'ёзна.)* Вось што я вам скажу: за ёю не шкодзіць наглядаць. Вы толькі зірніце, якога роду прэсу яна чытае. *(Паказвае газету.)* Орган канстытуцыяналістаў. І не сцясняецца пакідаць тут на лаўцы. А можаце вы сказаць, што чытае яна за зачыненымі дзвярамі?

Шышла *(напускае на сябе важнасць)*. Я, да, собственна, да, і не спускаю яе з вока.

Поп *(насмешліва)*. Вы, быць можа, глядзіцё на яе і дужа пільна. Ды я баюся, каб прыгожая шыльда не засланіла ад вас асноўнага.

Шышла *(задзеты)*. Не разумею, да, собственна, да, на што намякаеце вы, айцец Кандраці!

Поп *(хітра ўсміхаецца)*. Дух бодр, плоць немашчна. „Блюдите, како опасно ходите“. Жанчына-ж—сасуд граха. І, каб спакусіць святых аскетаў, шатан прымаў аблічча жанчыны.

Шышла. Гэта факт, да, собственна, да. Але-ж і начальства, пасылаючы мяне сюды, чым-небудзь ды кіравалася-ж... Шышла не сказаў яшчэ свайго слова.

Поп. А вуха трымаць трэба востра: гутаркі крамольныя пайшлі. Расце нейкая сукрытая варожасць. А каля настаўніцы народ пакручваецца. Баюся, каб не было якраз тут непатрэбных крамольных гутарак. На мне, як на пастыру, а на вас, як на агенту ўлады, ляжыць абавязак падтрымаць дух народу і патрыятызм. Давайце пройдземся—хачу аб сім-тым пагутарыць з вамі. *(Бярэ Шышлу пад руку. Выходзяць. Уваходзіць Марына з газетамі ў руках. Садзіцца на лаўку каля стала, кладзе на стол газеты.)*

Марына. Два месяцы ніякіх вестак ад яго. Што-ж бы гэта магло значыць? Ці ранены, ці забіты. Прадажная шайка казнакрадаў. Пасылаюць на ўбой безаружных людзей. *(Кладзе на стол газету, апускае галаву.)* Чаму ад яго няма пісем?.. Пачала пісаць яму пісьмо, ды куды пасылаць? *(Вымае пісьмо, піша.)* „Мілы, любы Алесь. Я так чакаю тваіх пісем, і так рада, калі яны прыходзяць, тады я бясконца шчаслівa і на момант забываю гэта штодзённае балеснае, поўнае жудасці водгулле вайны. Нявесела, мой мілы, тут. Гора, скаргі, бядота. Адна думка,—адно жаданне—скончылася-б вайна. Народ змучан вайною. Грунт для работы дужа падхадзячы. *(Марына піша. На двор школы уваходзяць дзед Мікіта і Аслаў.)*

Дзед Мікіта. Да тут яшчэ, чуй, дурань-браце, і няма нікога.

Аслаў. Як-то няма? А вось-жа настаўніца! Дзень добры вам!

Марына. Дзень добры. Сядайце.

Аслаў. Не турбуйцеся, знойдзем сабе месца. *(Садзяцца.)*

Марына. Ну, як жывеце, што добрага чуваць?

Дзед Мікіта. А што ў нас добрага пачуеш?

(Тэкля плача за кулісамі.)

Марына. Хто гэта.

Дзед Мікіта. Да гэта Тэкля, брата яе забілі.

Аслаў. Ох, гора наша... Вось прышлі, каб ад вас пачуць што-колечы. Вы-ж такі газеты чытаеце.

Марына. Не ўсю праўду і газеты пішуць. *(Бярэ газету, з іроніяй.)* Адступаем у поўным парадку, займаем новыя пазіцыі, як-бы гэта ўваходзіць у праграму нашага штаба. Дык, як-жа не будзеш адступаць з голымі рукамі!.. Варшава здана, Асавец пакінулі і Коўну аддалі.

Аслаў. Заўзяты-ж гэты немец—столькі гарадоў нашых пазабіраў.

Дзед Мікіта. І Коўну аддалі. Да гэта-ж ужо, чуй, дурань-браце, не так-та і далёка... Праклятая вайна і хто яе выдумаў.

Аслаў. Хто яе, кажаш, выдумаў?.. Эх, Мікіта! Хто нас гне, той нас і б'е.

Дзед Мікіта. Народу многа расплядзілася на свеце. Куды-ж народ падзець? Гані пад нож, як быдла на разніцу. І не будзе каму крычаць: зямлі, заработкаў. Зробіцца прасторна, а паноў ліха не возьме.

(Уваходзіць якісь салдат.)

Салдат. Дзень добры вам. *(Дзед Мікіта, Аслаў і Марына ўглядаюцца ў салдата.)* Не пазналі?

Дзед Мікіта *(кідаецца да салдата)*. Міхась, сынок! Адкуль-жа ты, ды як-жа ты гэтак неспадзявана. О, дурань-браце!

ГПБ Уз.

А с л а ў *(таксама кідаецца да Міхася).* Ваяка ты наш родны З таго свету вярнуўся!

М і х а с ь. Здароў, дзядзька Аслаў!

Д з е д М і к і т а. Зусім вярнуўся?

М і х а с ь. На кароткі час... Сам сабе водпуск даў. *(Да Марыны.)* Здрастуйце, Марына Мікалаеўна. Вам пісямко з фронта. *(Вітаецца, перадае пісьмо. Марына пазнае знаёмы почырк, адразу весялее. Крэпка трасе руку Міхасю. У веснічкі ўбягае Гараська. Нікога не зважае, крычыць.)*

Г а р а с ь к а. Дзядок, паліцыя клуню нашу трасе! Пазнаходзілі вобады і дубкі, тыя, што ты з панскага лесу прывёз. Цябе шукаюць! Хавайся—заарыштуюць!

Д з е д М і к і т а. А бадай-жа ж яе трасца трэсла! І парадавацца не дадуць... Да ты зірні, чуй, дурань-браце, хто прышоў!

М і х а с ь. Ты што-ж, жэўжык, не пазнаеш бацькі?

Г а р а с ь к а *(радасна).* Тата! *(Туліцца да бацькавай рукі. Міхась абнімае яго.)*

М і х а с ь. Глядзі ты яго, як вырас!.. Дык, кажаш, вобыск робяць?

А с л а ў. Без гэтага ніяк не абыдзешся.

Д з е д М і к і т а. Ох, ліха! Радавацца трэба-б, а радасці няма. Ох, жыццё наша!

М і х а с ь. Ну пойдзем, разбярэмся, у чым там справа.

(Усе выходзяць у бок пералазу. **Марына** застаецца адна, журботна праводзіць іх вачыма, моўчкі ківае галавой. Борздзенька разрывае канверт. Тарапліва прабягае вачыма пісьмо. Некаторыя мясціны пісьма чытае ўголас: *„Нашы пісьмы і пісьмы да нас праглядае ваенная цэнзура. Май гэта на ўвазе".* Марына адрываецца ад пісьма, слухае. За веснічкамі чуецца песня Караліны.)

К а р а л і н а *(спявае):*

Куды, куды, зайчык, скачаш?
Чаго, чаго, дзеўча, плачаш?
Зайчык скача ў чыста поле,
А ў дзяўчыны злая доля.

К а р а л і н а. Добры дзень табе, паненачка!

М а р ы н а. Як жывеш, Караліна?

К а р а л і н а. Вось ішла, ды думаю сабе: зайду на мамэнцік... Ты не гневайся!.. Не, не: маўчы! Бачу, усё бачу! Мала што я дурная Караліна! А я і гадаць умею, я знахарка! А можа і вядзьмарка! Вось хто я! *(Смяецца.)*

М а р ы н а. Дзе-ж ты хадзіла, што бачыла?

К а р а л і н а. Дзе хадзіла, кветачка мая ты? Па свеце хадзіла!.. Салдаты ідуць. Песні спяваюць... Вось весела ім! А людзі як дурныя, усё едуць і едуць. Запыняцца, пахаваюць дзіцятка каля дарогі і далей едуць *(кладзе на ганак палку).* Вось ты мне скажы што, кветачка мая ты... Уміраюць людзі. Хаваюць іх... Паложаць на мары і нясуць. Так і

пазносяць усіх... усіх пазносяць... Але астанецца нехта адзін... апошні. Дык як-жа ён, той панясецца, што адзін застанецца?

Марына *(стрымліваючы смех, напускае сур'ёзнасць, нібы гэта пытанне дужа важнае)*. Сапраўды, становішча яго вельмі труднае. І як адказаць на гэта, не ведаю.

Караліна *(уважліва глядзіць Марыне ў вочы)*. Не ведаеш? Вось-жа і я не ведаю... А можа хто здалёку прыдзе і пахавае... Ці няма ў цябе, кветачка мая ты, кусочка хлеба? Я табе пагадала-б за гэта.

Марына. Хлеба найду. Пабудзь тут, я зараз.

(**Марына** выходзіць, **Караліна** садзіцца на ганак. Кладзе кій пад лаўку, разгортвае далоні рук, уважна разглядае іх, ківае сама сабе галавою. Нечакана гаворыць: *„А Пятрусь кажух спаліў“*... Зрэдку аглядаецца па баках. Паказваецца **Шышла**. **Караліна** хаваецца пад лаўку. **Шышла** ідзе на ганак, не бачачы **Караліны**. Пазірае на стол. Перакідае газеты, знаходзіць лісты. Чытае першыя радкі пісьма.)

Шышла. „Дарагая, мілая, слаўная, Марынка!“ Дужа інтымна пачынае, шэльма! А пра што ён піша і хто ён такі, Шышла павінен ведаць. *(Кладзе пісьмо ў бакавую кішэню тужуркі. Чытае другое.)* „Мілы, любы Алесь!“ Алесь? Гэ, да тут раман, да, собственно, да! *(Кладзе пісьмо туды-ж.)* Шчаслівая акалічнасць, калі ўласныя інтарэсы супадаюць са службовымі. А цяпер Шышла знікне. Шышла яшчэ скажа сваё слова, да, собственно, да! *(Заварочваецца, каб ісці. Караліна з-пад лаўкі.)*

Караліна. На што ўзяў чужое? Палажы назад!

(**Шышла** знянацку палохаецца. **Караліна** вырываецца з-пад лаўкі, хапае Шышлу за рукаў, сама трасецца. Шышла вырывае рукаў, з сілаю штурхае Караліну. **Караліна** падае.)

Шышла. Пікні, шалёная ведзьма, яшчэ раз—заб'ю! *(Вымае шаблю, замахваецца над Каралінай, потым борздзенька шыбуе ў бок пералазу. Караліна ўстае, крычыць наўздагон.)*

Караліна. Начніца! Кажан! Злодзей! Хапун! Ты што забраў? Пастой! Вярніся!.. У-ля-ля-ля!

(Уваходзіць **Марына** з хлебам, пазірае ўстрывожаная на Караліну.)

Марына. Што тут за крык? На каго крычыш, Караліна?

Караліна. Злодзей! Торбахват!.. Бяжы, даганяй. Цар паліцэйскі з доўгім траплом пры боку! Штурхануў мяне, ды яшчэ засеч хацеў. Бяжы, даганяй!

Марына *(хапаецца за галаву)*. Шышла!? *(Марына тарапліва перабірае газеты, шукае пісем. Караліна стаіць моўчкі перапалоханая.)*

Марына. Няма—забраў. Бедная-ж галоўка мая! Што-ж я нарабіла!

Караліна. Я найду яго! Найду! З-пад зямлі адкапаю, гада лютага. *(Бярэ з-пад лаўкі кій, выходзіць. Марына, як скамянелая стаіць, узяўшыся за галаву. З вуліцы даносіцца песня Караліны:*

Я не такая, як тая другая:
І высокая і харошая,
Толькі-ж доля мая злая.)

Марына. Што-ж цяпер будзе? Загубіла я сваю радасць! Удала Алеся. Сама аддала ў рукі ворагаў. Што-ж рабіць? Згубіла Алеся!..

КАРЦІНА 2-ая

Дзея пераносіцца на кватэру Шышлы. Сялянская хата. Каля покуця стаіць просты стол. Над сталом, пад столлю, вісяць абразы па адзін і па другі бок кута. Ніжэй па адной з сцен вісіць партрэт Мікалая II і партрэты генералаў. Пахвальныя лісты ў рамках. Пад генераламі фатаграфія Шышлы. Гітара. Каля другой сцяны простая канапка. Маленькая шафа. Шышла ляжыць у радасным настроі, напявае пошлы раманс пад акампанемент гітары.

Шышла. Да, собственно, да, сітуацыя! *(Вынімае 2 пісьмы).* Папулярная сітуацыя! „Блюдите, како опасно ходите". Да, собственно, да: ходзяць, апасна ходзяць, ды толькі не Шышла. Што сказаў-бы ты, айцец Кандраці, калі-б у твае рукі папаў вось такі скарб? *(Выпівае.)* Будзь здаровы, айцец Кандраці! Шышла скажа сваё слова, да, собственно, да! *(Бярэ недапісанае пісьмо Марыны, чытае! „Мілы, любы Алесь".* Якая сардэчнасць: і мілы і любы! А ты, Шышла, аблізвай губы! Вось, адкуль яе холад. *Трасе галавою, з засмучэннем.)* Без канца рада, калі атрымае пісьмо ад яго! Ёй тут нявесела!.. Шышла-ж усё рабіў, каб даць табе вясёласць, крамольніца. А чым не кавалер табе быў Шышла? *Ад хвалявання пайшоў ды зноў прылажыўся да чаркі.)* Унь красавец які! Мужчына на заказ! Малады, сакавіты! І хіба не прыгожы? Адны вусы чаго варты!.. Але Шышла яшчэ скажа сваё слова, да, собственно, да. *(Зноў садзіцца.)* Піша—грунт для работы добры. Які гэта грунт? Якая такая работа?.. *(Пауза.)* Ось дзе ён, ключ, да гэтай работы! *(Трасе другім пісьмом.)* „Мая мілая, мая слаўная Марынка". Мая і мілая! Якая закаханасць! Мая і мілая. *(Чытае пісьмо.)* „Ачумела і астачарцела вайна, начатая царамі і гандлярамі"... Што піша, вы чулі? *(Чытае далей.)* „За вайну цяпер стаяць толькі паны, генералы ды розная сволач, што акапалася ў тылу, як, напрыклад, духоўны сышчык поп Кандрашка ды гэты глупы, тупы кабан Шышла..." І мяне ўспомніў! О, паршывец! Няхай сабе і глупы і тупы, а вось чытаю-ж тваё паганае крамольніцкае пісьмо. Шпіён нямецкі! Здраднік! І ўсё начыстую распісаў—зневажэнне свяшчэннай царскай асобы, падрыўная шпіёнская работа

на фронце, наглая прапаганда рэволюцыі... Вось ён, грунт іхняе работы! Ён—там, яна—тут!.. Папулярная сітуацыя! Не, гэта вам не ўдасца. *(Бярэ гітару і зноў пяе.) (Пасля спеву на дыване.)* Дык вось ён які, твой мілы, да, собственно, да *(зрываецца з дывана, бяжыць да стала)*. Вось Шышла і скажа сваё важкае слова, да, собственно, да!..

(Бярэ паперу, піша.) „Яго высокаблагароддзю, г. приставу 3-га стану. *(Радасна паціраючы рукі, пайшоў, выпіў і зноў да стала.)* Даважу да ведама вашага высокаблагародзія, што настаўнік нашага сяла Александр Петроў Шабура, які вярнуўся ў нашу вёску ў мінулым годзе з Архангельскай губерні, куды оный вышэйпамянёны быў саслан у 1912 г. за прапаганду супроць існуючага дзяржаўнага ладу і за перапіску з с.-д. фракцыяй IV дзяржаўнай думы, знаходзіўшыся пад маім наглядам, прыслаў зараз з фронта ліст да настаўніцы Марыі Кублік. Оный вышэйпамянёны Александр Шабура...“ Вось як пішуць адукаваныя людзі. „Оный вышэйпамянёны“. Оный вышэйпамянёны Александр Шабура піша ў гэтым пісьме наступнае. *(Ідзе да шкафчыка выпіць.) (Стук у дзверы.)*

Шышла. Хто там? Заходзьце! *(У дзвярах паказваецца Марына, усхваляваная, стараецца быць спакойнай.)*

Шышла. *(Папярхнуўся гарэлкай, незаметна хавае пісьмы.)* Сітуацыя! А, зрабіце ласку, сядайце. Якраз я аб вас і думаў. *(Расшарквaецца з усімі адзнакамі галантнага кавалера.)* Што-ж гэта прывяло вас у маю рэзідэнцыю, да, собственно, да?

Марына *(строга)*. Кіньце, Арцём Іванавіч гуляць у святую нявіннасць: добра ведаеце, за чым я прышла да вас.

Шышла. Скуль-жа мне, да, собственно, да, ведаць, што можа прыйсці ў галаву прыгожай дзяўчыне?

Марына. Давайце прасцей і бліжэй да справы.

Шышла *(сеў)*. Я вас слухаю, да, собственно, да!

Марына *(горача)*. Я вас прашу, як чалавека, у якога ёсць сэрца і хоць кропля чалавечнасці: аддайце пісьмы, якія належаць мне і якія бясчэсна, выбачайце, узялі вы ў мяне.

Шышла. А вы думаеце, што ў паліцэйскага Шышлы няма сэрца, да, собственно, да? Яно ёсць! Ёсць сэрца ў Шышлы і гэта сэрца даўно прагне вашага сэрца *(ласымі вачыма пазірае ў твар Марыне, аглядае яе ўсю, запаляецца і горнецца бліжэй)*.

Марына *(адходзіць ад яго)*. Дык давядзіце-ж гэта на справе: вярніце мне мае пісьмы, і я тады прызнаю сваю несправядлівасць у дачыненні да вас.

Шышла. Прыемна чуць з вашых прыгожых вуснаў, да, собственно, да! Але ці маю я права аддаць вам гэтыя пісьмы: яны належаць ні вам, ні мне, а закону. *(Прыцішана, голас перарываецца.)* Марына Мікалаеўна! Марыначка! Рыбка!

Шмат што залежыць ад вас самой. Для вас асабіста зраблю ўсё *(кладзе руку на яе руку)*. Але наўперад... я-ж вас люблю. Наўперад... задатачак *(Марына адступае)*. Вось яны тут гэтыя пісьмы *(стукае па грудзіне)*. Мы тут адны. *(Глядзіць на сцены.)* Багі, цар і генералы будуць маўчаць, а Шышла падтрымае Шышлу. *(Падыходзіць бліжэй, Марына стаіць нерухомая. Гэта прыдае смеласці Шышлу. Ён разнімае рукі, каб абняць Марыну.)*

Марына *(парывіста)*. Не смець дакранацца да мяне!

Шышла *(расшпіліўшы кіцель)*. Дык ты яшчэ брыкацца тут будзеш! Не, дудкі! Не на такога напала *(хапае Марыну ўпол)*.

Марына *(адбіваецца)*. Прэч, мярзавец! *(Кідае ў твар сальніцу.)*

Шышла. Шышла сваё возьме. *(Не выпускае Марыны з рук, цягне яе да канапы. Марына хапае рукой Шышлу за гарляк. Другой рукой намацвае шышлаў наган. Вырываецца з яго рук, адбягае да дзвярэй, наводзіць на Шышлу наган. Шышла слупянее.)*

Марына. Краніся з месца—застрэлю!

Шышла *(труслiва аглядаецца)*. Я... я... пажартаваў. Даруйце!

Марына. Станавіся на калені!

Шышла. А-а-апусціце наган! Вы-ж і абыходзіцца з ім не ўмееце. Знянацку застрэліце чалавека.

Марына. На калені! *(Шышла прысядае, становіцца на калені.)*

Марына. Даставай з кішэні пісьмы і кідай іх мне сюды!

Шышла. Апусціце наган, а то рукі трасуцца. *(Расшпільвае тужурку. У гэты момант адчыняюцца дзверы, уваходзіць поп. Запыняецца на парозе.)*

Поп. Да ўваскрэсне бог... *(Хватае Марыну за рукаў. Марына перапужалася. Наган знячэўку страляе ў падлогу. Поп і Шышла кідаюцца на зямлю. Марына выбягае.)*

Шышла. Ратуйце мяне, айцец Кандраці! *(Шышла і поп ляжаць некаторы час моўчкі.)*

Поп *(падымае галаву)*. Што сіе значыць?

Шышла *(устае, садзіцца, аглядваецца)*. Сітуацыя! Шышла быў ужо на тым свеце *(набіраецца смеласці, паказвае папу пісьмы)*. Але Шышла яшчэ скажа сваё слова, да, собственно, да. *(Падбягае да акна, свішча ў свісток.)*

Заслона.

АКТ III

КАРЦІНА 1-ая

1916 г. Акопы. Выбухі снарадаў. Атрад адбівае атаку немцаў. Уперадзе паручык Жухін у смяртэльным страху туліцца за каменем, прынікаючы да зямлі.

Жухін *(здушана, парывіста перадае каманду па ланцугу)*. Перадаць па цэпі—гатовіцца ў контратаку! *(Бліжэйшы салдат, якому аддае каманду Жухін, маўчыць. Жухін паўтарае нервова.)* Перадавай па цэпі—гатовіцца ў контратаку! *(Салдат не адклікаецца. Жухін падпаўзае да салдата, штурхае.)* Чуеш каманду?—перадавай па цэпі—гатовіцца ў контратаку! *(Салдат не варушыцца. Жухін палохаецца, рэзка падаецца ад салдата.)* Забіты! *(Адпаўзае ад яго да суседняга салдата.)* Перадавай па цэпі—зараз ідзем у контратаку!

Голас салдата. Гатовіцца ў контратаку!

Жухін. Узмацняй кулямётны агонь!

Салдат. Патронаў няма.

2-гі салдат. Усе вышлі патроны!

Жухін. За мной, братцы, ура!

(Салдаты ўсхопліваюцца (некаторыя ляжаць нерухліва) з дзікім крыкам „ура" бягуць наперад, збіваючыся ў адзін паток. Трэск стрэлаў мяшаецца з надрыўным жудасным крыкам. Крык аддаляецца, глухне, пераходзіць у стагнанне „а-а-а-а-а" Нарэшце заціхае зусім, становіцца ціха. Некаторы час на сцэне пуста. Толькі чутны асобныя выстралы. Пауза. Атрад часцю перабіты варочаецца пад прыкрыццё.)

Жухін *(камандуе)*. Пад укрыццё! *(Салдаты ўпаўзаюць друг за другам.)*

Жухін. Узвод—стой! Вольна! *(Аглядае парадзелы ўзвод.)* Ну-с, рэбяты, тут нам аддышка. Узводны! Прадставіць мне спісак забітых, раненых і прапаўшых без весці.

(Чуюцца галасы: „*Прывал*"... „*Грэй зямельку сваім целам*". Уваходзіць **Будан-Рыльскі**.)

Жухін. Дазвольце далажыць, г. капітан, атака адбіта.

Будан-Рыльскі. Вольна. *(Ідзе міма забітых.)* Вынесці! Вынесці!

Патап *(спыняецца над трупам)*. Жывы яшчэ! Жывы! Макар, любы *(стогн)*. Ваша высокаблагародздзе, яшчэ жывы!

Б у д а н-Р ы л ь с к і *(бачыць у глыбіні труп, не пачуўшы слоў Патапа).* Вынесці!

П а т а п. Вынесці лягчэй чым вылечыць. Гузырык, па сястру давай хутчэй, родны. *(Гузыр выбягае; стогн.)*

П а т а п. Вады, хлопчыкі! Кроў затрымаць трэба. *(Рве сарочку, робяць перавязку.)*

П а т а п. Асцярожна, браткі, лягчэй!

Г у з ы р *(убягае).* Знойдзеш ты тую сястру, калі яно трэба.

П а т а п. Насілкі, Гузырык!

Г у з ы р. Няма, шукаў.

П а т а п. *(Голасам камандзіра.)* Хлопцы, вінтоўкі ў рукі, з двух канцоў узяць. Жыва!..

Б у д а н - Р ы л ь с к і *(злосна).* Хто тут камандуе?

П а т а п. Гэта!!.

Б у д а н - Р ы л ь с к і. Што?

П а т а п *(узяўшы сябе ў рукі).* Гэта хворы ў гарачцы каманду падае.

Б у д а н - Р ы л ь с к і. А!

П а т а п. У, Будан бруднае рыла! *(Выносяць параненага.)*

Д р о б *(разглядаецца, выбірае месца, шпурляе на зямлю амуніцыю).* Ах будзь ты тры разы проклята!.. Хадзіце, хлопцы ў гурт, весялей будзе.

П а т а п. Распрагайся,—знімай салдацкі хамут. Хадзі, прафесар, да нас: пусцім дымок, каб дома не журыліся. *(Алесь падыходзіць моўчкі.)* Ну, вось і ўся наша загаруйская фамілія. *(Дастаюць кісеты, скручваюць цыгаркі.)*

Г у з ы р. Пакурыць добра наеўшыся. А жаваць дык вось і няма чаго.

П а т а п. Паходная кухня яшчэ не прыехала... Жывем па шляхецку—папалам клёцку.

Г у з ы р. А па мужыцкім шчоце—па тры клёцкі ў роце. Чачавічкі згатуюць. Раней кармілі ёю коней ды перасталі: шэрсць вылазіць пачала. А цяпер—салдат чачавічку хлябай. *(Усе хорам ціха пяюць песню: „Ай, ты гора“. У часе песні адзін з салдат гаворыць суседу, вынімаючы пісьмо:* „Ліст з вёскі атрымаў ад жонкі. Прадалі карову за даўгі, бяда пайшла, разруха. Малое дзіцё ад голаду памерла“.)

Д р о б. *(Тупа ўставіўшыся ўдол.)* І так з дня ў дзень, з ночы ў ноч, ужо два гады!.. І ніякай прасветліны. *(Песня кончылася.)* Калі-ж той канец, га?

А л е с ь. Не тужы, дружа! Няма на свеце нічога, што-б не мела свайго пачатку і канца.

П а т а п. Жар, прафесар, лекцыю, ды павесялей: калі не накорміш галоў, дык ашукай хоць кішку.

Г у з ы р *(скептычна).* Галаву можна ашукаць, а кішку—ніколі.

П а т а п. Верна, брат: вайна—самы праўдзівы прыклад.

Д р о б *(да Алеся).* А з канцом-жа як?

Алесь. А вось я табе на гэта што скажу. Стаяла ў садзе яблыня. Завёўся на ёй чарвяк і патачыў усе яе плады. Застаўся ўгары адзін толькі яблык, уцеха і апошняя надзея яблыні. І вось бачыць яна—паўзе чарвяк, каб і той яблык згрысці. З гора, са страху, з бяды і са злосці страсянула тады яблыня ўсімі лісцямі. Узняўся вецер і скінуў чарвяка на голую сцежку. А там садоўнік растаптаў яго нагою. Вот і ўсё.

Дроб. Навучыўся ты ў школе байкі дзецям расказваць. Ты мне проста скажы.

Алесь. А ты падумай, дружа. Не ўсё, што проста, можа адразу ясным паказацца.

ЗАПЯВАЛА. Тучки темны, тучки грозны
По поднебесью плывут.

ХОР. Гэй, гэй, охо-хо,
По поднебесью плывут.

ЗАПЯВАЛА. Наши храбрые стрелочки
Сели в поле отдохнуть.

ХОР. Гэй, гэй, охо-хо,
Сели в поле отдохнуть.

(За сцэнаю чуваць пявучы, вясёлы жаночы голас. Салдаты прымаўкаюць, слухаюць.)

Жаночы голас *(смех перарывае апошні куплет)*. Ну, што вы кажаце? Не паверу!

Мужчынскі голас. Сур'ёзна, мілая сястрыца! Вы,—як гаворыцца,—ангел, пасланы богам у пекла вайны!

Гузыр. Ці не наш гэта новы ротны, земскі начальнік?

Жаночы голас. Як красамоўна вы гаворыце, але я не дапускаю такой скараспеласці.

Мужчынскі голас. А між тым—гэта святая праўда, як праўда і тое, што я—капітан Будан-Рыльскі.

(Салдаты пераглядаюцца.)

Дроб. Ваяка: і на немцаў у атаку гоніць і сам ідзе ў атаку на бабу.

Будан-Рыльскі *(набліжаецца)*. Вы, можа, хочаце, як гаворыцца, довадаў праўдзівасці маіх слоў? Дык вот яны. *(Некаторая замінка, валтузня, лёгкія ўздыхі.)*

Патап *(іранічна)*. Атакуецца камандная вышыня. Вось яна *(пазнаўшы сястру)*, дзе сястрыца міласэрдная. Гэта замест таго, каб хворых даглядаць. *(Падмігвае, а потым моўчкі падымае палец угору, адыходзіць, становіцца на выцяжку.)*

Жаночы голас *(зблізку каля сцэны)*. Ах, вашы губы порахам пахнуць. Люблю запах пораху.

(Паказваецца Будан-Рыльскі з сястрою пад ручку. Патап падае каманду.)

Патап. Устаць! Смі-і-ірна!

Сястра *(уздрыгвае)*. Ох!

Будан-Рыльскі. Чаго, дурак, гарланіш? У часе адпачынку каманда „ўстаць“ і „смірна“ пры паяўленні начальства не падаецца.

Патап. Вінават, ваша высокаблагароддзе!

Гузыр. Ваша высокаблагароддзе! Галодны мы. Вёска пустая. Харчоў няма.

Будан-Рыльскі. Ведаеш салдацкую службу? Хочаш есці, зацягні тужэй рэмень на жываце. А не паможа—смакчы свае пальцы. *(Пад руку з сястрой праходзяць.)*

Сястра *(за сцэнай)*. Які вы строгі. Баявы афіцэр!

Будан-Рыльскі. Наглець пачынае салдатня, дай толькі ім волю... Зойдзем, сястрыца, да мяне ў зямлянку, паглядзіце, як гаворыцца, на маю баявую абстаноўку.

(**Гузыр** зрываецца з месца, хапае стрэльбу, кідаецца ўслед за **Буданам-Рыльскім і сястрою.** Патап хватае **Гузыра** за плечы.)

Патап. Стой! Куды ты?

Гузыр *(не помнячы сябе, вырываецца)*. Пусці! На штык пасаджу сволача, пакажу яму нагласць.

Салдат. А правучыць белую костку не памяшала-б.

Галасы. Шкуры-б драць з такіх паскудаў.

Алесь *(не пускае Гузыра. Гаворыць цвёрда, як старшы)*. Не вар'яцей. Што ты дакажаш гэтым?

(Алесь, Патап і Дроб акружаюць Гузыра.)

Патап. Кінь, Андрэй, не рабі глупства. Прыхавай сваю злосць на потым. Буры ты не падымеш. З-за аднаго такога сцервы... не варта! Давай сваю качаргу!

Гузыр *(аддае вінтоўку, злосна)*. Першая куля—у яго паганую мазгаўню.

Алесь *(мякка)*. Не трэба, дружа, гарачыцца.

Дроб. Многа ўжо іх, паганцаў такіх, бралі на мушку, ды толку не было, а цярпеў наш брат.

Голас салдата. І будзе цярпець, калі спускаць.

Патап *(сур'ёзна)*. Не гарачыцеся, хлопцы! І не кідайцеся ў вір, з галавой, не падумаўшы. Адна ластаўка вясны не робіць.

(Уваходзіць Дзяменя.)

Дзяменя *(запыняецца, аглядае ўсіх)*. Здарова, землякі, арлы баявыя! Што за шум, а дракі няма, прыгарні вас цёплая ручка і мяккая пасцелька.

(Паяўленне Дзямені ажыўляе салдат.)

Дроб. А, Дзяменька! Што новага прынёс?

Патап. Здароў, лапатун. Дзе хадзіў?

Алесь. Што чуў?

Дзяменя *(адмахваецца рукамі)*. Што ў вас...?? *(Заўважае панурыя твары Гузыра і другіх салдат і хоча развесяліць іх.)* Што ў вас за мода штурхаць чалавека? Калі мне

было яшчэ сем месяцаў, дык я ўжо ў матчыным жываце штурхаўся нагамі:—думалі, што з мяне барабаншчык будзе.

Патап *(жартліва)*. А вышаў салдат службы сувязі, ды і то недарэчны.

Дзяменя. А як толькі я на свет нарадзіўся, дык замест таго каб заплакаць, я спяваць пачаў. Бабка сказала, што з мяне баян выйдзе.

Патап. А вышаў лапатун-балбатун.

Дзяменя. Маўчы, шахцёр, вугляная галава! Дай мне пра сябе расказаць. Панеслі мяне кумы да папа хрысціць. Пытае поп, як назваць? Кумы і кажуць: „Баян". Поп быў глухі, недачуў, і запісаў „Дзямян".

Патап. І ўсё-ж такі самае падхадзяшчае імя табе—балбатун.

(Усе смяюцца, нават Гузыр усміхнуўся.)

Дзяменя *(дакорліва трасе галавою)*. Каб я не балбатаў дык вы-б тут з нуды пазаходзіліся.

Патап *(гледзячы на павесялеўшых Гузыра і Дроба па-прыяцельску стукае па плячы)*. Верна! Балбачы, балбачы, браток! Цяпер Цэяруж заўсёды на нягоду балбоча.

Дзяменя *(многазначна)*. А можа і на добрую пагоду.

Алесь. О, каб вуснамі младзенца ды ісціна загаварыла!

Галасы. Раскажы, што чуваць на тваёй лініі.

Дзяменя *(расчаравана)*. Як відаць, зімаваць будзем тут. *(Да Алеся.)* Аб табе, брат прафесар, спраўляліся ў канцылярыі палка.

Алесь *(занепакоены)*. Як спраўляліся?

Дзяменя. Шукаюць па ротах... Радавы Аляксандр Пятроў Шабура... Ці ёсць, пытаюць, такі?

Алесь *(устрывожана)*. Вось яшчэ ліха, ёлкі-палкі. Навошта я ім здаўся?

Патап. Можа для пасылкі ў школу прапаршчыкаў. Ты-ж чалавек вучоны.

Алесь. Не падабаецца мне, калі салдатам канцылярыя палка цікавіцца. Ты, Дзяменька, разнюхай гэта.

Дзяменя. На тое-ж і нос, каб нюхаць, а калі Дзяменя возьмецца за што, дык ну...

(Высоўваецца салдат.)

Салдат. Эй, падымайцеся з пасцелі! Гарачыя храновіны паспелі:—кухня прыехала!

Другі салдат. Кацялкі бяры!

Трэці салдат. Не напірай, хлопцы. *(Салдаты падымаюцца, бразгаюць кацялкі. Выходзяць.)*

(Астаюцца Дзяменя, Патап і Алесь.)

Алесь. Эх, ёлкі-палкі! Прызнацца, устрывожыў ты мяне, Дзяменька! Баюся, каб не даведаліся там.

Патап *(з трывогаю ў голасе)*. Ты думаеш?

Алесь. Даўно сказана, дружа... „Няма нічога патайнага, што-б не сталася яўным".

Дзяменя. Калі праўду казаць, то і мне гэта трохі цюкнула.

Алесь. Важна, каб не заспелі знянацку. А ты, Дзяменька, пакапайся ў гэтай справе да разведай, у чым тут яна. Вось што, хлопцы, на ўсякі выпадак у мяне яшчэ захаваліся адозвы,—„Вайна—вайне". Вось яны—перадаў мне падпольшчык Максім Кучаравы.

Патап. Адозвачкі харошыя. Іх трэба перасоўваць салдатам розных часцей ды так, каб ад гэтага карысць для справы была.

Дзяменя. Давай іх мне: ні адна не прападзе. Ужо калі возьмецца за што Дзяменя, дык ну!.. *(Алесь дастае з ватоўкі жмутак паперы, перадае Дзяменю.)*

Дзяменя *(хавае іх у патронную сумку)*. Цар-бацька патронаў не дае, дык я адозвы сюды палажу замест патронаў.

Алесь. Патроны гэтыя слаўныя. А цяпер, хлопцы, вячэраць. Прыхваціце і на маю долю. Ідзіце, а я зараз з вамі.

Дзяменя. Ужо калі Дзяменя возьмецца за што, дык ну!

(Патап і Дзяменя выходзяць. Алесь астаецца адзін. Некаторы час сядзіць моўчкі, абняўшы рукамі калені.)

Алесь. Горш за ўсё, што нічога не ведаеш. І так і гэтак думаецца. Спраўляліся, у якой роце знаходжуся. Для чаго спраўляліся?

(Уваходзіць Патап з ежай для Алеся.)

Патап. Ты, брат прафесар, запішы: плюнь і не трывожся: у бяду цябе не папусцім. На, пасярбай. *(Выходзіць.)*

Алесь. Эх, выматалі нервы за гэтую подлую вайну... Не, галубчыкі, не давесці вам яе да пераможнага канца! Я загіну, тысячы загінуць, а ход падзей пойдзе сваёю дарогаю. *(Спявае.)*

Ночка цёмна, я баюся,
Правадзі мяне, Маруся.

Тфу! Якая пошлая песня лезе ў галаву. Яе толькі і пачуеш тут ад афіцэраў і сясцёр-вярціхвостак.

(У цемнаце паказваецца постаць чалавека ў шынялі.)

Хто ідзе?

Чалавек у шынялі. Выбачайце, зямляк, ці не скажаце мне, дзе раскватаравана дзевятая рота?

Алесь. А хто вы такі?

Чалавек у шынялі. Я прыбыў з эшалонам з тыла. Шукаю свайго земляка, знаёмага.

Алесь. У якім ён узводзе?

Чалавек у шынялі. Быў у трэцім.

Алесь. Як прозвішча яго?

Чалавек у шынялі. Шабура, Александр Шабура.

Алесь. Шабура? Быў такі. *(Сам сабе.)* Няўжо мяне шукаюць! Быў такі. Але, здаецца, яго цяпер няма.

Чалавек у шынялі. Няма?.. А дзе ён?

Алесь. Рота нядаўна вышла з бою. *(Змаўкае. Чалавек у шынялі бяссільна асядае. З яго плячэй спаўзае шынель. З-пад шыняля відна жаночая жакетка з белым нагруднікам і чырвоным крыжам. Алесь праціраe вочы. Падыходзіць усутыч, асцярожна ссоўвае з ілба незнаёмай салдацкую шапку.)*

Алесь. Марына?!

Марына *(абуджаецца з аняменння, момант пазірае ў твар Алесю)*. Алесь! мілы! Гэта ты? Ты-ж на смерць перапалохаў мяне: думала, што ты забіты. *(Туліць галаву Алесю на грудзі, уздрыгвае ад здушанага плачу.)*

Алесь. Не сніў і не марыў сустрэцца з табою тут. Супакойся, Марынка!..

Марына. Нарэшце я знайшла цябе. Ты жывы і цэлы.

Алесь. Ніяк не спадзяваўся... Ну, як ты, Марынка, адважылася?.. Як папала сюды?

Марына *(вінавата апускае галаву)*. Няшчасце, Алесь, пагнала мяне сюды.

Алесь. Няшчасце?! Што здарылася?

Марына. Ты памятаеш пісьмо, што прыслаў мне праз Міхася? Яно ў Шышлы, у руках паліцыі.

Алесь *(пасля паузы)*. Цяпер мне ясна, чаму пытаюць пра мяне ў канцылярыі палка і шукаюць па ротах.

Марына. Трэба ўцякаць. Мяне таксама шукае Шышла. Таму я цяпер не Марына Кублік, а Ірына Загайская. Я запісалася ў сёстры ў палявы салдацкі гошпіталь, каб хутчэй знайсці цябе і паведаміць аб небяспецы.

Алесь. Мілая, мая слаўная! А цяпер падумаем, як быць. Ведаеш, Марынка, на якую думку навяла ты мяне зменай свайго прозвішча? А што, калі я запішуся ў спіс забітых? Узводны свой чалавек, салдаты свае людзі. Дык няхай жыве забіты Шабура, а на яго месца ажывім забітага Макара Макарука. Ідэя добрая, ты будзеш замест Марынкі—Ірынкай, а я замест Алеся—Макарам. А ўцякаць мне няма куды і ўцякаць я не магу і не смею.

Марына *(з жахам)*. Што ты гаворыш? Калі не шкадуеш сябе, дык мяне ты пашкадуй. Уцякай, уцякай адгэтуль, пакуль не позна. Ці ты баішся дэзертырам стаць? Адступіся хоць на нейкі час ад сваёй ролі. Узваж яшчэ раз халодным розумам... Слухай, Алесь,—мне страшна вымавіць гэта: ці не мыляешся ты, стаўшы на шлях паражэння? Вораг прыставіў нож к сэрцу Расіі!

Алесь. Не варта было шукаць мяне, каб сказаць такую ісціну. Я-ж даўно перастаў ёй верыць. І калі Расія—заўваж, царская Расія, будзе паражана ў сэрца, то я толькі вітаць

буду гэта. Мяне трымае тут не дэзертырства з фронта, а дэзертырства з тае справы, якая робіцца на фронце. Калі ты любіш і паважаеш мяне, дык палюбі і тую справу, якую я люблю.

Марына. Я люблю цябе, Алесь, але я люблю і праўду. Дзе-ж яна, праўда?

Алесь. Ты пытаеш, дзе праўда. Я прышоў да яе, Марына, таксама тысячамі дарог, прышоў праз свае пакуты і пакуты мільёнаў, праз іх убоства, бяспраўе, слёзы і кроў. Яна для нас ясна цяпер: буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю трэба давесці да канца. Разам з усім сялянствам раздавіць мы павінны самадзяржаўе, памешчыкаў. Але-ж гэта толькі поўсправы. Пралетарыят і яго партыя Леніна—Сталіна рушаць рэвалюцыю далей. Разам з бяднейшым сялянствам, з батрацтвам, з усімі эксплаатуемымі, супроць буржуазіі і кулакоў-крывасмокаў, спекулянтаў і купцоў, пралетарыят пойдзе да соцыялістычнай рэвалюцыі.

Марына *(апускае галаву, нясмела, ціха)*. А калі гэта праўда пойдзе дарогаю яшчэ большай крыві?

Алесь *(сурова)*. Усёроўна, якою-б дарогаю не ішла, абы прышла.

Марына. Вайна зрабіла цябе жорсткім да чалавека, Алесь.

Алесь *(мякка)*. Ты памыляешся, Марына. Вайна навучыла мяне яшчэ болей любіць чалавека, і калі ты цяпер гаворыш так, то голас твой далятае да мяне здалёку.

Марына *(з горкаю крыўдаю)*. А ці далятаў ён да цябе хоць калі зблізку?

Алесь *(з гараччу)*. На што рабіць такія закіды, Марына? Будзь шчыра сама з сабой... Такі час быў тады, калі мы разам чакалі рэвалюцыі і рабілі ўсё, што маглі, каб наблізіць яе.

Марына. Прызнаюся, Алесь, мілы. Я раней заўсёды разумела цябе, а цяпер ты гаворыш нейкай чужой мовай. Зразумей, я баюся, што рэвалюцыя ў часе вайны прывядзе краіну да пагібелі.

Алесь. Царскія міністры таксама кажуць: наўперад заспакаенне, а потым рэформы.

Марына. Ты ні кроплі не маеш да мяне жаласці, Алесь! Спатканне з табою, якога я так прагла, з-за якога я так пакутвала, прынесла мне не радасць і спакой, а гора і трывогу. Хіба-ж магу я быць спакойнай, калі цябе шукаюць, каб арыштаваць? Ты адзін на свеце блізкі мне чалавек, а стаў якімсьці чужым, далёкім. Дарогі-ж назад у мяне няма. Мне толькі застаецца ісці далей адной, адзінокай...

(Голас Жухіна: „*Правае плячо ўперад марш, раз, два!*“ Марына, спалохаўшыся, выходзіць.)

А л е с ь *(бяжыць за ёю)*. Марына, пачакай!.. Спыніся, Марына

(Уваходзіць узвод салдат.)

(Жухін і першы афіцэр.)

(Алесь, убачыўшы ўвайшоўшых, варочаецца, не дагнаўшы Марыны.)

Ж у х і н. Ну вось, адпачылі, падзакусілі.

Д з я м е н я. Нам, ваша благароддзе, адпачываць нельга... Нам трэба айчыну ад ворага абараняць, каб чужаземная нечысць на святую расійскую зямлю не ступіла і не паганіла наша неба.

Ж у х і н *(радасна)*. Ну! ну!

Д з я м е н я. І толькі тады, калі слаўныя салдаты, верныя сыны нашага бацькі-цара перамогуць паганага ворага.

Ж у х і н *(у захапленні)*. Тады...

Д з я м е н я. Тады можна будзе адпачыць.

Ж у х і н. Дзякуй!

Д з я м е н я. Рад старацца!

Ж у х і н. Даўно не чуў я такіх прадзіўных і адданых слоў. Даўно *(зварочваючыся да першага афіцэра)*. Хто сказаў, што ў рускага салдата няма веры, што ён ваюе, не разумеючы за што?

(Моцна ціснe руку Дзяменю.)

Д з я м е н я. *(Усе глядзяць на яго, ледзь стрымліваючы смех.)* Так точна, ваша благароддзе.

(Жухін і першы афіцэр выходзяць.)

Д з я м е н я *(убок)*. Рускі салдат пачынае разумець, за што яму трэба ваяваць.

Канец першай карціны.

КАРЦІНА 2-ая.

ПРАДВЕСНЕ 1917 ГОДА.

Афіцэрская зямлянка. У зямлянцы Будан-Рыльскі, камандзір батальёна, капітан; падпаручык Жухін і некалькі афіцэраў. Збоку каля зямлянкі, наверсе, стаіць Дзям'ян, прылажыўшы вуха—падслухвае.

Б у д а н-Р ы л ь с к і. Вам вядома, гаспада, што манархія пала. Улада перайшла да часовага ўрада. Мы, як гаворыцца, не палітыкі, мы — ваенныя людзі. Наша задача — захаваць боездольнасць арміі. А наш полк мае нядобрую славу. У дзевятай роце вёў у свой час здрадніцкую работу радавы Шабура, пісьмо якога было перахвачана ў тылу паліцыяй і паслана ў штаб палка. Гэты здраднік, на шчасце, лічыцца ў спіску забітых, і справа аб ім спынена.

Д з я м е н я *(пасміхаецца і сам сябе падміргвае)*. Жывы. І па сёнешні дзень, і справа яго цяпер не ў канцыляры палка, а ў Дзямені, вось тут у кішэні. *(Стукае рукою па кішэні.)*

Будан-Рыльскі. Гаспада! Але горш за ўсё, што побач з часовым урадам арганізаваўся так званы Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Ён выпусціў, з пазвалення сказаць, прыказ № 1. Прыказ гэты—пачатак і вогнішча разбурэння арміі. Ні ў якім разе не паказваць яго салдатам, не гаварыць аб ім!

Дзяменя *(сам сабе)*. Не, брат: прыказік гэты мы з-пад зямлі выкапаем!

Будан-Рыльскі. Давайце, гаспада, абсудзім палажэнне. Яно прымушае шукаць новых спосабаў. Ваша слова, гаспада!

(Будан-Рыльскі садзіцца. Некалькі момантаў афіцэры маўчаць.)

Першы афіцэр *(дваранін, насмешліва)*. Эпіграфам да мае прамовы могуць служыць словы раманса:

„Я угасаю с каждым днем
И злобы в сердце нет моем".

А самую прамову выкажу так:

„Все это было бы смешно,
Когда бы не было так грустно".

Будан-Рыльскі. І гэта, паручык, усё?

Першы афіцэр. А болей, што казаць? Палажэнне, я сказаў-бы, закавырыстае і безнадзейнае... Не ў часе рэвалюцыя...

Паручык Жухін. А ці правільна будзе, г. капітан, не паказваць салдатам прыказ № 1? Як можна схаваць такі дакумент, што афіцыяльна апублікован па войску? Гэта можа выклікаць толькі яшчэ большае недавер'е да афіцэраў з боку салдат.

Дзяменя. А які чорт, калі вам верыў?

Будан-Рыльскі. Ні ў якім разе не паказваць яго салдатам. А гаварыць: гэта фальш, гэта нямецкая выдумка, бо шкоды ён наробіць многа, калі аб ім даведаюцца салдаты.

Дзяменя. У бутэльку ўлезем, а даведаемся!

Будан-Рыльскі. Рэвалюцыя пераблытала, як гаворыцца, карты і паставіла нас у труднае становішча. Але няма таго крытычнага палажэння, з якога-б не было выхаду.

Дзяменя *(скептычна трасе галавой)*. Не хваліся.

Першы афіцэр. Даваў генерал задачу афіцэру". Два флангі вашай роты атакованы пяхотай праціўніка. Спераду на вас налятае конніца, ззаду б'е артылерыя, а над галавою аэрапланы скідаюць бомбы. Якую вы падасцё каманду". Афіцэр адказвае: „На малітву, шапкі далоў!"

Дзяменя. Ну, калі да малітвы справа даходзіць у вас, дык значыць—салдат радуйся.

Будан-Рыльскі. Наша палажэнне не такое труднае, як тое, аб якім гаворыце вы, паручык. Мы, як гаворыцца, не асвоіліся яшчэ з новай сітуацыяй.

Д р у г і а ф і ц э р *(кадравік)*. Калі свабода зачынаецца з развалу арміі і з прынцыпа выбарнасці ў войску, то асінавы кол у спіну такой свабодзе.

П е р ш ы а ф і ц э р. Правільна.

Д з я м е н я. Вось сволачы.

Б у д а н-Р ы л ь с к і. Не можна, гаспада, сеч з пляча. Зараз патрэбна іншая тактыка, адна толькі зброя—слова.

Д з я м е н я. Бабка варажыла, варажыла, ды галавою налажыла.

П е р ш ы а ф і ц э р. Паможа тут слова, як мёртваму кадзіла.

Ж у х і н. Гаспада! Рэволюцыя выбіла вас з сядла, і вы ўпалі ў адчай. А становішча не такое ўжо страшнае. Мы павінны перш за ўсё растлумачыць салдатам сэнс рэволюцыі. Трэба змяніць таксама і свае адносіны да салдат, стаць з імі на роўную нагу.

Д з я м е н я. Ці таварыш гусь каню?

П е р ш ы а ф і ц э р. Як гэта ліберальна і гуманна! Усе парабіліся соцыялістамі-рэволюцыянерамі.

Ж у х і н. Не ў лібералізме і не ў соцыялістах-рэволюцыянерах тут, што называецца, сіла: сіла ў той правільнай лініі, якую павінны заняць афіцэры, каб павесці, што называецца, за сабою армію.

Б у д а н-Р ы л ь с к і. Дык так, гаспада. Палажэнне, як гаворыцца, ахаўскае, але не безнадзейнае. Бліжэй да салдата, гаварыце з ім, раз'ясняйце сэнс перавароту. Валі на старую ўладу ўсе нашы няўдачы. Курс браць на партыю соцыялістаў-рэволюцыянераў. Яна ўсіх пагодзіць. Яна за вайну і за дысцыпліну ў войску. Выведваць настрой салдат. Аб прыказе-ж № 1 ні слова! Дык з богам, гаспада!

(Святло ў зямлянцы выключаецца. **Дзяменя** адрываецца ад зямлянкі, бяжыць, потым запыняецца.)

Д з я м е н я. Ох, ох, Дзяменя! Мілы ты мой, Дзяменя! Повен ты цяпер, як ніколі: ну як той клешч, што насмактаўся крыві з сабачага вуха! Ах, афіцэрыкі!.. Бягу, бягу. *(Кідаецца бегчы. Выходзіць Марына. Дзяменя запыняецца.)* Сястрыца, шкадую, што вы не мужчына.

М а р ы н а *(здзіўлена)*. А што, Дзяменька?

Д з я м е н я. Пацалаваў-бы вас. Такія навіны!

М а р ы н а *(смяецца)*. А хіба-ж мужчыну прыемней цалаваць?

Д з я м е н я. Яно то... не, але-ж адвага тут патрэбна.

М а р ы н а. Дык рэволюцыя?

Д з я м е н я. Самая сапраўдная... Дарэчы, сястрыца: ці не бачылі прыказа № 1?

М а р ы н а. Я яго маю.

Д з я м е н я. Да ну? Дайце мне яго!

(**Марына** дастае лісток, аддае **Дзяменю**).

М а р ы н а. Вось ён. Парадуйце ваякаў.

(**Дзяменя** прасоўвае руку ў ватоўку, вымае пакет, аддае **Марыне**.)

ГПБ

Дзяменя. Дар за дар... Гэта тое, што зрабіла вас сястрою, а прафесара прымусіла ў нябожчыка запісацца, мяне-ж злодзеем зрабіла—у штабной канцыляры ўкраў. Цяпер за гэтыя дакументы з вас абаіх нагарода належыць.

Марына. Мілы Дзяменька! Ну, які-ж вы дасціпны! *(Бярэ пакет, вымае паперы.)* Яны аплаканы горкімі слязмі. Я буду хаваць іх, як кайданы і як святыню.

Дзяменя *(з гордасцю)*. Да ўжо-ж калі Дзяменя за што возьмецца, дык ну!.. Пабягу-ж я, сястрыца: не церпіцца мне.

КАРЦІНА 3-яя.

Дзея пераносіцца ў салдацкія акопы. На сцэне адрэзак акопаў дзевятай роты. Два канцы іх расходзяцца ў бакі і губляюцца ўводдалі. Шырокі ўваход у акоп. У акопе відна група салдатаў. Сярод іх **Дроб, Думака, Гузыр**, яны пяюць песню: *„Старана чужая"*.

ХОР.

Старана чужая не родная маці.
А касцей салдацкіх нагацілі гаці.
Эх, ваюй, ваюй, салдат!
Выступай за радам рад!
За гарой, за лесам ліха, смерць блукае,
А крумчак у госці крумчакоў склікае.
Эх, ваюй, ваюй, салдат!
Па зямлі паўзі, як гад!
У сырых акопах гіне люд рабочы,
А там дома жонка праплакала вочы.
Эх, ваюй, ваюй, салдат!
За цара, за царанят!
Над зямлёю цяжка злегла ноч сляпая,
А ў каго матуля пра сынка спытае.
Эх, ваюй, салдат, ваюй!
Смокча кроў тваю буржуй!
Рассяваеш косці ты, салдат, па свеце,
А там з галадоўлі пухнуць жонка, дзеці.
Эх, ваюй не так, салдат!
Паварні ты штык назад!

(У часе песні па сцэне паўзе **Дзяменя**. Не даходзячы да самага ўваходу ў акоп, падае каманду.)

Дзяменя. Устаць і сустрэць Дзяменю! *(Салдаты мітусяцца, высыпаюць з акопа, акружаюць Дзяменю.)*

Патап. Што, шуміш іскравая рота?

Дзяменя. Браты мае, рэволюцыя!

Галасы. Ці не брэшаш? Факты давай!

Дзяменя. Царызма пала! Міністраў арыштавалі! Новы ўрад. Совет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. *(Трасе прыказам № 1.)* Вось ён, факт! Вось дакумент, што хаваюць ад нас афіцэры! Прафесар! Нябожчык-прафесар! Выпісвайся са спіскаў забітых! Ажыві! На, чытай нам уголас. *(Падбягае Алесь, бярэ прыказ № 1, момант глядзіць у яго, потым кідаецца на шыю Дзяменю, цалуе яго).*

Алесь. Факт, таварышы, рэвалюцыя прышла!

Дзяменя. Чытай, чытай нам маніхвест, ды чытані так, каб аж заграніцаю пачулі.

Алесь *(чытае)*. Совет рабочих и солдатских депутатов постановил:

1. Во всех ротах, батальонах, полках, батареях, эскадронах и на судах военного флота немедленно выбрать комитеты из выборных представителей от нижних чинов вышеуказанных воинских частей.

Патап. Братцы вы мае. Пішы—сваё начальства будзе.

Алесь. *2. Во всех воинских частях избрать в Совет рабочих и солдатских депутатов по одному представителю от рот, которым явиться с письменным удостоверением в здание государственной думы к 10 ч. утра 2 сего марта.*

Гузыр. А, душа з іх вон! Палавіна сакавіка, а мы нічога не ведаем.

Галасы. Сволачы! Скруціць думалі!

Алесь. Увага, таварышы!

3. Во всех своих политических выступлениях воинская часть подчиняется Совету рабочих и солдатских депутатов и своим комитетам.

Галасы. Малайцы! Добра запісана.

Алесь *(чытае)*. *„В строю и при отправлении служебных обязанностей солдаты должны соблюдать строжайшую военную дисциплину, но в частной жизни солдаты ни в чем не могут быть умалены в тех правах, коими пользуются все граждане. В частности, вставание во фронт и обязательное отдавание чести вне службы—отменяется“.*

Патап. Для генералаў гэта—пішы, як кажухом па печы.

Алесь *(чытае)*. *„Равным образом отменяется титулование офицеров:—ваше превосходительство, благородие и т. п. и заменяется обращением: г. генерал, г. полковник и т. д.“.*

Дзяменя. Да я яго просту буду зваць: „Эй, ты, генерал! Сюды ідзі“. *(Салдаты смяюцца.)*

Алесь *(чытае)*. *„Грубое обращение с солдатами и в частности обращение к ним на „ты“ воспрещается!“* Падпісана: *„Петроградский Совет рабочих и солдатских депутатов“. (Кончыўшы чытаць, Алесь агглядае салдат.)* Чулі, таварышы. Вось ён *(трасе прыказам)* наш салдацкі дакумент. Касуецца шэрая скацінка. Салдат стаў чалавекам, грамадзянінам. Ён вызвален ад афіцэрскага прыгона. Няхай жыве рэвалюцыя!

Салдаты. Ура!

(Дроб выносіць гармонік, іграе заліхвацкі матыў. Салдаты танцуюць, гікаюць, выгукваюць: *„Свабода“, „Рэвалюцыя“, „Наша бярэ“, „Ура рабочым і салдатам“.)*

Дзяменя. Увага! Слухайце мяне *(шум змаўкае)*. Тэлефонаграму даць немцам!

Галасы. Правільна.

(Дзяменя шукае, што надзець на штык, нарэшце дагадваецца зняць бот, разгортвае парцянку, надзяе на штык. Вылазіць за бруствер акопа.)

Дзяменя. Германішэн! Браткі немцы! Салдаты! Сказаў-бы ім па-нямецку, да язык грэцкі. Гэр-мэр! У нас рэволюцыя. *(Раздзельна.)* Рэ-во-лю-цыя! Годзі ваяваць! Далоў вайну!

(З нямецкіх акопаў чуваць галасы: „Рус! Рус! Гох! Рус".)

(Уваходзіць Будан-Рыльскі. Яго не бачаць. Ён стаіць моўчкі, ледзь стрымліваецца.)

Патап. Далоў гандлярскую вайну.

Дзяменя. Годзе ваяваць, далоў вайну!!

Будан-Рыльскі. Так! *(Усе салдаты павярнуліся. Цяжкая пауза. Будан злосна выбягае.)*

Дзяменя *(услед Будан-Рыльскаму).* Цешыўся старац, што пеpажыў марац. Ажно ў маю нясуць яго да гаю.

КАРЦІНА 4-ая.

Той-жа самы ўчастак фронта. Бліжэйшы франтовы тыл. Салдацкі мітынг. На мітынгу абмяркоўваюцца пытанні міра і вайны.

Патап Думака. Ужо другі месяц, як пачалася рэволюцыя, мы-ж усё яшчэ гніем у акопах. За гэты час пабывала тут шмат народу, розных прадстаўнікоў ад розных партый. Што-ж яны гавораць нам? Яны кажуць: „Ваюйце, вольныя салдаты! абараняйце свабоду, нашы героі!" Усе яны дудзяць на адной дудцы: і меншавікі і эсэры. Словам, таварышы, канца вайне не відаць. А як мы, салдаты, ставімся да вайны? У нас—так і пішы—адно жаданне: кончыць яе як найхутчэй.

Галасы. Верна! Праўда!

Патап Думака. Хто-ж нас у гэтым падтрымлівае? Хто выказвае нашы набалелыя жаданні, нашы мыслі, нашы пачуцці? Толькі адна партыя,—гэта партыя большэвікоў. Большэвікі кажуць нам: „Салдаты! вы самі бярыцеся канчаць вайну. Братайцеся з вашымі праціўнікамі—яны такія-ж як і мы, рабочыя, сяляне. Дабівайцеся, каб уся ўлада перайшла советам. Ці правільна гавораць большэвікі?

Галасы. Правільна.

Патап Думака. Дык давайце, таварышы, самі канчаць вайну. Давайце правядзем братанне арганізавана, цэлымі часцямі. Гэтым наблізім мір і канец вайны. *(Дастае жмут газет.)* Вот вам, таварышы, наша салдацкая газета „Окопная правда". Яе пішуць людзі, што стаяць за мір, за нашага брата салдата, за народ, са сапраўдную свабоду. *(Салдаты нарасхват бяруць газеты. Галасы: „Пачытаем сваю „Акопную праўду". „Даволі кармілі нас буржуі сваімі газетамі".)*

Голас з натоўпу *(дзесь з глыбі).* Але ці няма тут, таварышы, ашуканства? Іхняга правадыра, Леніна, немцы падкінулі ў Расію.

Алесь. Хлусня, таварышы, кадэцкі паклёп, каб аганьбіць партыю большэвікоў.

Патап. Хто гаварыў, што Леніна немцы падкінулі? Выступі тут перад народам, мы паслухаем і пабачым, што ты за чалавек. Мы ўсім даем слова. Гавары што хочаш. Дык выходзь на народ. *(Ніхто не выходзіць.)*

Галасы. Гэта буржуйчык прытаіўся тут.

Алесь. Хто хоча яшчэ гаварыць?

Галасы. Ды яно-ж ясна. Мы за большэвікоў.

Другі голас. Самі будзем канчаць вайну.

Алесь. Дык, значыцца, таварышы, правядзем шырокае братанне. І другія роты і палкі будзем заклікаць да гэтага. Бо толькі такім чынам і можна дабіцца канца вайны. Дык згодны, таварышы?

Галасы. Згодны.

Алесь. Прагаласуем. Хто за гэта, падыміце рукі. *(Салдаты дружна падымаюць рукі. Алесь радасна пераглядаецца з Патапам.)* Мітынг скончан. Будзьце, таварышы, смелы, рашучы, упарты, і мы свайго даб'емся.

Адзін з салдат. Ну, хлопцы, цяпер трымайся. Наш лёс у нашых руках.

Другі салдат. Чэчавічку хлябаць зараз не будзем, чорта з два.

Трэці салдат. Уся ўлада советам. Вось калі на нашай вуліцы будзе свята!

Чацвёрты салдат. Да бабы сваёй вярнуся. Свае-ж пусцяць.

Адзін з салдатаў. Браткі мае, дамоў прыду, а гэтую качаргу к чортавай матары.

Патап. Ну, гэту качаргу пры сабе прыхавай. Спатрэбіцца...

Голас. Я капітану за свае зубы рахунак падам.

Адзін з салдатаў. Ну, прафесар, дахаты разам паедзем за кампанію.

(Салдаты разыходзяцца з песняю. **Алесь** астаецца на сцэне.)

Алесь. *(Песня салдат ціха аддаляецца.)* Якая незвычайная для фронта цішыня! Фронт замірае. Шчаслівы будзе той час, калі ён замрэ тут назаўсёды. *(Піша ў сваю кніжку. Здалёку паказваецца Марына. Запыняецца, асцярожна разглядаючыся. Бачыць Алеся. Борздзенька падыходзіць да яго. Момант стаіць моўчкі.)*

Марына. Так захапіўся, што і не бачыць нічога.

Алесь. Марынка! Здарова Марынка-Ірынка! Прышла? Не забыла?

Марына. Я ніколі не забываю цябе, але зараз я на хвілінку. Алесь, слухай: тое, што вы робіце і збіраецеся рабіць тут, вядома там. Праўда, што вы ладзеце масавае братанне?

Алесь. Цяпер гэта звычайная з'ява. Яе не схаваеш. І хаваць не збіраемся.

Марына. Вы мяркуеце тут па-своему, а там употайку гатуюць вам пастку.

Алесь. Пастку? Якую пастку?

Марына. План іх пякельны. „Мы“,—кажа гэты Будан-Рыльскі, „падстроім так, што іхняе братанне самі немцы расстрэльваць будуць“. Сцеражыся! Вы можаце загубіць тысячы людзей, вас змяшаюць з прахам: артылерыя папярэджана і падгатавана, яна на іх баку.

Алесь. Будан-Рыльскі! Удалае імя! Будан, Бруднае Рыла!

Марына. Ты ўсё жартуеш, Алесь, а ў мяне сэрца не на месцы, калі падумаю, што загінуць тысячы народу.

Алесь. Дзякую за дапамогу. Значыць ты цяпер зразумела, што праўда на нашым баку? Значыць ты пойдзеш за мной?

Марына. Усюды з табою. Я веру цяпер толькі табе і Патапу. Жыццё на фронце раскрыла мне вочы. Я ўвесь час ахоўвала вас і дапамагала вашай справе. Ведаеш, мне часамі здаецца, што яны дагадваюцца аб маёй ролі. Але не гэта мне страшна... *(Абрывае гутарку. Пауза. Другім тонам.)* Ну, бывай-жа! А калі даведаюся пра што, паведамлю. *(Выходзіць. Алесь глядзіць ёй услед.)*

Алесь. Пайшла і нібы большую часць ад мяне забрала з сабою. А хацелася-ж казаць яшчэ так многа і так сардэчна! *(Сядзіць моўчкі, схіліўшы галаву.)* Даведаліся... Ставяць пастку... Як-жа быць?

(Уваходзяць Максім Кучаравы і Патап.)

Алесь. А, таварыш Максім, добра, што ты прышоў. Хадзеце, браткі, сюды.

Патап. Ты што, прафесар, стаіўся тут?

Алесь. Справа, браткі, такая, што аднае прафесарскае галавы мала.

Патап. Ну?

Алесь. Будан-Рыльскі пранюхаў пра братанне!

Патап. Ну, дык што? На гэта і нюхаўкі спецыяльнай не трэба.

Алесь. Справа ў тым, што ён рыхтуе нам пастку. Артылерыю паставілі расстрэльваць братальнікаў.

Патап. Гэта факт?

Кучаравы. Я гэтага і баяўся:—у артылерыі шмат афіцэраў і вольнапёраў.

Патап. А ты адкуль даведаўся?

Алесь. Марына сказала.

Кучаравы. Марыне верыць можна. Я наглядаў за ёю. Яна— наша.

Патап. Ну, што-ж. Адступаць не можна, прафесар.

Алесь. Не можна, гэта ясна. Але калі мы правалім братанне, дык мы дыскрэдытуем і самую ідэю яго.

Кучаравы. Трэба павесці справу так, каб правалу не было. Слухайце.

КАРЦІНА 5-ая.

Дзея пераносіцца ў афіцэрскую зямлянку. У зямлянцы Будан-Рыльскі і тры ротныя камандзіры.

Будан-Рыльскі. Чаму большэвізм залівае тыл і так востра паражае сваёй гангрэнай фронт? А таму, што большэвізм кажа салдату: гані сваіх афіцэраў—яны твае класавыя ворагі і стаяць за вайну. Адбірай зямлю ад памешчыкаў і фабрыкі ад фабрыкантаў, і ты станеш багатым.

Жухін. Гэтага мала, г. капітан: большэвікі давялі салдату і пераканалі яго ў тым, што вайна для яго не мае сэнсу, як грабежніцкая вайна ў інтарэсах багатых класаў... Яны прапаведваюць іншую вайну...

(Убягае афіцэр.)

Афіцэр *(узрушана)*. Г. капітан. Другі і трэці батальён і дзве роты першага выступаюць з акопаў пад белым сцягам братацца. Выступленне пачынае дзевятая рота.

Будан-Рыльскі. Дзякую, паручык *(да афіцэраў)*. Сачыць за рухам здраднікаў. Аб кожным руху дакладаць мне. *(Афіцэры выбягаюць з зямлянкі, глядзяць у біноклі. Будан-Рыльскі кідаецца да тэлефона.)*

Будан-Рыльскі. Алло, батарэя? Капітан Сумяцін? Здрастуйце. Капітан Будан-Рыльскі. Будзьце гатовы. Сектар—3, квадраты № 13 уключна па № 24 выключна... Вельмі рад. Так, так. Дзякую.

Афіцэр. Г. Капітан. Дзевятая рота выходзіць з белым сцягам. Паяўляюцца адзіночныя людзі на ўчастках 10 і 11... Натоўп павялічваецца. Рады гусцеюць. Стаяць на месцы... Паказваюцца немцы. Накапляюцца. Фронт шырыцца... Г. капітан, пара!

Будан-Рыльскі *(хватае трубку тэлефона)*. Алло, алло! Капітан Сумяцін? Адкрывайце агонь! Сектар—3, квадраты 13—24. *(Вешае трубку.)*

Афіцэр. Г. капітан... Самы час... Тысячы!..

Будан-Рыльскі *(нервова)*. Што-ж яны не страляюць? *(Бярэцца за трубку тэлефона, грыміць гарматны стрэл. Будан-Рыльскі адыходзіць ад тэлефона, радасна хрысціцца.)* Дзякуй богу... Назірайце, гг., узрывы. *(Мёртвая цішыня. Афіцэры стаяць, пазіраюць у біноклі. Званок тэлефона. Будан-Рыльскі знімае трубку.)*

Будан-Рыльскі. Алло, я, я... Што? У процілеглы бок?.. Сволачы! *(Шпурляе трубку, у ярасці б'е кулаком па тэлефону, да афіцэраў.)* Павярнулі хобаты гармат у процілеглы бок. Выстралілі адзін раз... у штаб свае дывізіі.

Братаюцца таксама артылерысты з пехацінцамі. Мярзаўцы! Негадзяі!

А ф і ц э р. Якая мерзасць! Якая ганьба!

Д р у г і а ф і ц э р. *(Выхватвае рэвольвер, каб страляць у салдат. Яго ўтрымліваюць.)*

Ж у х і н *(безнадзейна).* Лішнія мы тут і непатрэбныя.

КАРЦІНА 6-ая.

Бліжэйшы франтавы тыл. Прасторны пусты двор, запоўнены салдатамі. На пярэднім плане Дроб і Гузыр. Салдаты соваюцца па двары, выходзяць і прыходзяць. Сям-там сядзяць па некалькі чалавек. (Ціха хтосьці спявае сумна: *„Ах ты, гора наша“.*)

Д р о б *(сядзіць на бервяне, курыць цыгарку).* Правініліся, значыцца, перад буржуямі. Як заразную, роту вывелі з акопаў *(смяецца).* Ну-ж і злосці было ў Будана-Рыльскага. Ось, думаў, гакну, аж нічога не вышла.

Г у з ы р. Адлучылі, каб лягчэй справіцца. За дысцыпліну бяруцца. Керэнскі, чуеш, на фронт едзе. Строгасць. Зноў у наступленне гнаць будуць.

Д р о б. Няхай Керэнскі сам і наступае. Які дурань будзе наступаць яму? Самому на мазоль наступаюць, вось і круціцца.

Г у з ы р. Глядзі, каб і нас не ўкруціў.

Д р о б. Няхай ён лепш сам сабе галаву скруціць *(вымае зватоўкі нейкую рэч, загорнутую ў газету).*

Г у з ы р. Судзяць-жа нас, Паўлюк, чуў? За братанне.

Д р о б. А няхай судзяць. Прысудзяць у Сібір? Дык чым горш Сібір за вайну? *(Мяняе гутарку.)* Спрытныя, падлы, гэтыя немцы. Якія добрыя штучкі выробляюць. Вот ты зірні, Андрэй, якую хвацкую брытву падараваў мне на памяць нямецкі салдат!

Г у з ы р *(разглядае брытву).* Хвацкая брытва, ядры яе качан.

Г о л а с. Таварышы, сюды!

Дроб хавае брытву. З усіх куткоў двара збягаюцца салдаты, збіваюцца ў круг. На калодцы ў сярэдзіне круга стаіць Патап.)

П а т а п. Таварышы! Мы толькі што даведаліся, што нас зараз прыдуць абяззбройваць. Палкавы суд, дзе большасць было афіцэраў і прыслужнікаў буржуазіі, пастанавіў расфармаваць нашу роту за тое, што мы праводзілі братанне.

К у ч а р а в ы. Таварышы, помніце, мы цвёрда пастанавілі не пакарацца ніякім іхнім судам. Запамятайце гэта!

Д р у ж н ы я г а л а с ы. Не здавацца! У штыкі ўзяць іх суд!

Д з я м е н я *(ускоквае на калодку).* Таварышы, стаяць да канца цвёрда. Вінтовак з рук не выпускаць. Яны за вайну да пераможнага канца, а мы за сваю вайну. І калі мы дапусцімся, каб нас абяззброілі, то мы не салдаты. А калі пазволім арыштаваць каго з нас, то мы не таварышы.

Голас. Ідуць!

(Паказваецца Будан-Рыльскі, з ім група салдат і афіцэраў. Рота замаўкае. Будан-Рыльскі з групаю падыходзіць бліжэй. Будан-Рыльскі аддзяляецца на некалькі крокаў ад групы, падыходзіць да дзевятай роты.)

Будан-Рыльскі. Ну-с, так званыя салдаты! Мы прышлі сюды па даручэнню палкавога камітэта. Палкавы камітэт разам з прадстаўніком ад часовага ўрада і армейскага камітэта разгледзеў, як гаворыцца, справу салдат дзевятай роты. Пастанавіў (*вымае паперку, чытае*): „За здраду айчыне, што выразілася ў форме пагалоўнага братання з ворагамі, роту абяззброіць і расфармаваць! (*Прыходзіць Марына, неспакойная, устрывожаная. Прыпыняецца збоку, слухае.*) Радавых Макара Макарука, Дзяменю Дзям'яна, Патапа Думаку, як зачыншчыкаў і падбухторшчыкаў арыштаваць і судзіць ваенным спецыяльна вызначаным судом.

Алесь. А рота даручыла мне заявіць, што пастановы чужога і варожага камітэта яна не прызнае і падпарадкоўвацца ёй не будзе. Гэта адно. Другое: Макар Макарук забіты ў баю 20 лістапада мінулага года.

Патап. Судзіць любіце, г. капітан! Судзілі, будучы земскім начальнікам, і цяпер судзіце. Але нябожчыка Макара Макарука дарма засудзілі: як яго цяпер арыштуеш? Пішы прапала.

Дзяменя. Нябожчыкаў судзяць! Вось якая іхняя праўда! Я таксама нябожчык, калі на тое пайшло!

Будан-Рыльскі. Мярзаўцы! Што за камедыянства?!

Галасы. Ад мярзаўца чуем! Вон старарэжымшчык! (*Будан-Рыльскі адступае на крок. Свішча ў свісток. Марына стаіць сашчапіўшы рукі. Парываецца ісці, але стрымліваецца. Да яе падыходзіць Будан-Рыльскі.*)

Будан-Рыльскі. Любіце батальныя сцэны? Ідзіце адгэтуль, сястрыца, вам тут не месца.

(Чуецца густы барабанны бой. Паказваюцца салдаты ў поўнай баявой выпраўцы. Уперадзе **афіцэр**. Абарочваецца назад, рукою дае знак спыніць барабаны. Падыходзіць да **Будана-Рыльскага**. Напружаная цішыня. **Афіцэр** бярэ пад казырок, рапартуе.)

Афіцэр. Г. капітан. Батальён у складзе васьмісот штыкоў пры васьмі кулямётах прыбыў.

Будан-Рыльскі. Вы паступаеце ў маё распараджэнне. Ваша задача—абяззброіць зараз-жа гэту банду, не спыняючыся ні перад якімі мерамі.

Афіцэр (*бярэ пад казырок*). Слухаю, г. капітан (*да сваіх салдат*). Заняць указаныя пазіцыі і чакаць майго загаду. Паставіць кулямёты на пярэднюю лінію.

Афіцэр (*да салдат дзевятай роты*). Прыказваю: зараз-жа здаць вінтоўкі і амуніцыю. (*Салдаты дзевятай роты маўчаць, не рухаюцца.*)

Афіцэр. Яшчэ раз і апошні раз паўтараю—здаць вінтоўкі і амуніцыю!

(У радах роты хістанне. Некаторыя салдаты робяць рух для выпаўнення загаду. Два чалавекі выходзяць з радоў, каб здаць вінтоўкі: іх не пускаюць. Чуецца голас: *„Здраднік“*, *„Трус“*, *„Ганьба“!* З радоў салдат-усмірыцеляў выходзіць салдат.)

Салдат-усмірыцель. Ад імя салдацкага камітэта франтавікоў прыказваю безадкладна выпаўняць загад! Цэрамоніцца з вамі не будзем! *(Хістанне ў радах роты павялічваецца. Яшчэ некалькі салдат выходзяць, аддаюць вінтоўкі.)*

Алесь. *(Вырываецца на сцэну, згортвае кулакі, трасе імі. Да салдат, здаўшых вінтоўкі.)* Сорам і ганьба вам! Вы не таварышы! *(Зварачваецца да ўсмірыцеляў.)* Таварышы! Ці-ж вы падымеце руку на вашых братоў? на свабоду, што заваявалі мы нашай кроўю?

Будан-Рыльскі *(у абурэнні кідаецца з наганам на Алеся).* Заткні глотку, нямецкі агент! Шпіён! Узяць яго!

(Салдаты-ўсмірыцелі акружаюць Алеся.)

Патап. Ці не сорам вам, таварышы! Вас прывялі, як паліцэйскіх і па-паліцэйску вы выступаеце!

Будан-Рыльскі. Заткні глотку, нямецкі агент! Даволі бальшэвіцкіх мітынгаў!

(Сярод салдат шум. Шум пракочваецца і па радах салдат-усмірыцеляў.)

Голас з радоў усмірыцеляў. Даць яму сказаць!

Другі голас. Так не можна! Гэта не стары рэжым!

Будан-Рыльскі *(трасучыся ад злосці).* Не смець мітынгаваць! Забараняю!

(Шум нарастае. Афіцэр збянтэжана азіраецца. **Марына** зрываецца з месца, выбягае на сцэну.)

Марына. Браты-салдаты! Родныя, апамятуйцеся! *(Шум заціхае. Выступленне Марыны і яе словы робяць уражанне сваёй нечаканасцю.)* Адумайцеся, што вы робіце? Вашымі рукамі расчышчаюць тут дарогу вашай-жа няволі, яны капаюць тут магілу вашай свабодзе і кідаюць вас брат на брата. Зразумейце-ж вы гэта!

Будан-Рыльскі. Шпіёнка! Правакатар! Большэвіцкая патаскуха!

Алесь. *(Вырываецца з групы канвойнікаў, падбягае да Марыны. Па адрасу Будан-Рыльскага.)* Не смей абражаць жанчыну, сволач, царскі халуй!

(**Будан-Рыльскі**, калоцячыся як у ліхаманцы, падымае наган, страляе ў **Алеся**, але **Марына** ўспела яго засланіць. **Марына** хапаецца рукой за бок, падае. Сярод салдат шум і рух. Да **Будана-Рыльскага** падбягае **афіцэр**. Чуецца яго голас: *„Што вы зрабілі, капітан?“*. Афіцэры хутка выходзяць. Галасы салдат: *„Забіў жанчыну!“* *„Сястру забіў!“*, *„Дзяржы забойцу!“*. Каля **Марыны** група салдат. **Алесь** расшпільвае на ёй тужурку. З кішэні курткі відаць беражок пакета. Бярэ руку **Марыны**, слухае пульс.)

А л е с ь. Кончана жыццё! *(З болем.)* Даруй, Марынка. Маю кулю прыняла ты ў сэрца. Гвалтаўнікі! Забойцы! Каты! Перад людскім судом адкажаце вы за гэтыя дакументы чалавечай пакуты, слёз і крыві!

(Убягае **Дзяменя**. Спыняецца перад трупам **Марыны**.)

Д з я м е н я. Сястрыца, родная наша! *(Згортвае кулакі.)* Забойцы! Не схаваецеся! Адкажыце кроўю за кроў!

П а т а п *(абарочваецца ў той бок, куды ўцёк Будан-Рыльскі.)* Запішы гэта на сваім каінавым ілбе!

К у ч а р а в ы. Вось яна агідная расправа! Вось яны нашы класавыя ворагі! Змаганне толькі пачынаецца! Таварышы, арганізавана, дружна возьмемся за справу, за агульную справу...

Заслона.

АКТ IV

Тая-ж вёска, што і ў 1-м акце. **Поп** ловіць вудачкамі рыбу, да яго падыходзіць **Бухрай**.

Бухрай *(хітра з намёкамі)*. Вось, бацюшка, і ваду замуцілі, а рыбка штось не ловіцца.

Поп. Што замуцілі, дык замуцілі. І чым далей, тым горай.

Бухрай. І як-то гэта каб ды без начальства? Ну, што такое народ без цвёрдай апекі? Ні села, ні пала, а ўжо ходзяць з сажонкамі ды зямлю абмяраюць. Сёння панскую, а заўтра і маю і бацюшкаву.

Поп. Ох, і не кажы, Яўхімовіч. *(Закідае вуду. Бухрай паволі адыходзіць, сам сабе з дакорам ківаючы галавою.)* *(Пауза.)* *(Поп глядзіць на паплаўкі.)* Ох, госпадзі божа мой! І рыба не клюе. Дух большэвізма ўсю прыроду абуяў. *(Здалёку выходзіць чалавек, адзеты салдатам.)* Што-ж гэта за салдацюга? Ці не агітатар іхні, што-б ён галавою налажыў! Ці гэта які рэквізітар бандыт?

Чалавек, адзеты салдатам *(здалёку)*. Маё шанаванне, айцец Кандраці!

Поп *(няветла, панура)*. Здрастуй! *(Падазрона аглядае салдата.)*

Чалавек, адзеты салдатам *(падыходзіць, спыняецца)*. Не пазналі, да, собственно, да?

Поп *(у радасці)*. Арцём Іванавіч!.. Даруйце, не пазнаў адразу. Думаў—рэквізітар большэвіцкі. Ха-ха-ха... Каб не ваша прымоўка, дык і не пазнаў-бы, ісцінны бог!

(З-за вугла паказваецца **Караліна**. Згледзіўшы папа і **Шышлу**, падаецца назад, сама сабе робіць знакі перасцярогі. Спыняецца, прыслухоўваецца да гутаркі, мімікаю рэагуе на яе.)

Шышла. Я-ж і хачу, каб мяне не пазнавалі. Інкогніта хаджу, да, собственно, да.

Поп. Так, так, я вас разумею, г. Шышла... Навіны якія ёсць?

Шышла. Вы хутка пачуеце і ўбачыце іх сваімі вачыма, айцец Кандраці. А Шышла справу робіць, да, собственно, да! *(Мяняе тон.)* Скажыце, айцец Кандраці, хто завадыякамі быў у разграбленні маёнтка г. Будана-Рыльскага... і наогул. Маю даручэнне экстранна сабраць спраўкі.

Поп *(баязліва азіраючыся.)* Я іх усіх ведаю. Зойдзем да мяне, Арцём Іванавіч.

(Поп прапускае наперад Шышлу, азіраецца. Выходзяць. Караліна нясмела выцягвае галаву, глядзіць ім услед, потым ступае крокі два, запыняецца. Стаіць, ківае сама сабе галавою. Грозіць пальцам у той бок, куды пайшлі Поп з Шышлам. Мімікаю, рухамі выказвае свой страх і нейкія свае мыслі.)

Караліна. Шышла... Шышла... Паліцэйскі цар. Салдатам ходзіць. Салдатам, мае красачкі. А які страшны! Салдатам ходзіць! З белага ў шэранькага перакінуўся. *(Раптам змаўкае, прыкладае палец да кончыка носа.)* Але на што вусы астрыг, красачкі мае вы. Няўжо для таго, каб харашэйшым быць. Вось фацэцыя... Пайду, пайду-ж я ад вас далей...

(Выходзіць дзед Мікіта і Аслаў з сажанкай.)

Дзед Мікіта *(прадаўжаючы гутарку).* Паны сабе так думаюць: „А, не да ўпадобы вам былі паны і буржуі, папраганялі нас, дык вось паспрабуйце без нас жыць". Гэта значыць, чуй, дурань-браце, каб мы ім зноў рукі цалавалі.

Аслаў. А няхай ім лепей сырая зямля вочы зацалуе.

Дзед Мікіта. Людзі-ж, чуй, дурань-браце, кажуць, што яны заграніцу сюды заклікаць ладзяцца, каб скінуць большэвікоў, свабоду і зямлю адабраць.

Аслаў. Але ад зямлі мужыка, покі мужык жыве, ніхто не адарве.

Дзед Мікіта. Ну, гэта чуй, дурань-браце, гледзячы, як хто рване. *(Насустрач выходзіць Бухрай. Пазірае на дзеда Мікіту і Аслава. Спыняецца, з дакорам ківае галавою.)*

Бухрай. Ой, старыя, нядобра вы робіце: не любіць зямля, калі па ёй ходзяць без належнай пашаны да яе.

Аслаў *(сярдзіта).* А ты вось скажы: ці любіць чалавек, калі з яго цягнуць жылы і смокчуць кроў павукі і кляшчы.

Бухрай. Хто гэта—павукі і кляшчы?

Аслаў. А тыя, што абдзіраюць народ ды на яго бядоце свае кішкі гадуюць ды салам абрастаюць.

Дзед Мікіта *(абурліва).* Пытае, хто павукі, чуй, дурань-браце. *(Да Бухрая.)* А ты не клешч, не павук?

Бухрай *(таксама ў абурэнні).* Я, я—павук, клешч. Я, што раскідаюся хлебам, каб дапамагчы галоднаму.

Дзед Мікіта. А колькі ты, воўчы трыбух, чуй, дурань-браце, скур за гэты хлеб злупіў. Сколькі скаціны, зямлі сабе за вайну прыдбаў... Дабрадзей. Няхай такіх дабрадзеяў і зямля не носіць.

Бухрай. Ты глядзі, гарлапан стары, каб гэты сажонак не пахадзіў яшчэ па тваёй спіне... Распасцёр пастку. Тфу ты, чорт паганы, каб ты праваліўся. *(У злосці выходзіць.)*

Дзед Мікіта *(услед Бухраю, згортвае фігу).* Вось табе фігурацыю за тваю турбацыю. Сам праваліўшся, чуй, дурань-браце.

А с л а ў. Бачыш, як не залюбіў: праўда вочы коле. *(Непадалёку чуецца песня Караліны.)*

Сядзіць зайчык на мяжы,
Што ён думае, скажы.
Зайка з поля ў лес бяжыць,
Добра зайку ў лесе жыць.

Д з е д М і к і т а. Ты вось заўваж, Аслаў: ужо колькі разоў прымячаю я, што як толькі пакажацца яна, дык зараз-жа нейкае ліха следам за ёю. Праціўная, чуй, дурань-браце, кабета.

К а р а л і н а. Жывы яшчэ, мужчынкі. Жывеце, старыя алешыны. А чулі вы, што паліцэйскі цар шэранькім зрабіўся і вусы астрыг. Вось фацэція. Ха-ха-ха. *(Залівaецца доўгім дурным смехам.)*

Д з е д М і к і т а. Тфу.

А с л а ў. А ты, Караліна, хвацка смяешся.

К а р а л і н а *(не слухае)*. Ды чаго смяюся. Тут можа плакаць трэба, а я смяюся.

Д з е д М і к і т а. Ідзі ты, чуй, дурань-браце, куды ідзеш!

К а р а л і н а. Ой, які ганарысты!.. Ты глядзі—кажан лётае!

(Накідваецца са смехам на Мікіту. Выходзіць.)

Д з е д М і к і т а *(плюе)*. Тфу! Чаўпе нямаведама што, аж слухаць моташна... І жывуць-жа такія людзі на свеце!

(Бяжыць **Гараська**.)

Г а р а с ь к а *(перапалоханы)*. Дзядок! Нейкія салдаты прышлі з афіцэрам! Двары трасуць!

Д з е д М і к і т а *(устрывожаны)*. Якія салдаты? Адкуль?

А с л а ў *(палохаючыся)*. З афіцэрам? Ну, то дабра не будзе!.. А можа гэта немцы? *(Азіраюцца і бездапаможна топчуцца.)*

(За сцэнаю шум. Чуваць тупат конскіх капытоў, брэх і выццё патрывожаных сабак, галасы перапалоханых людзей і крыкі. Чотка даносіцца чыйсьці начальніцкі голас: *„Знасіць рэчы на плошчу! Туды-ж вядзі і падбухторшчыкаў!“*)

Д з е д М і к і т а. Што-ж гэта ёсць такога?

Г а р а с ь к а. Уцякайма, дзядок, хаваймася!

А с л а ў. Вось не было яшчэ ліха!

(**Дзед Мікіта, Аслаў** і **Гараська** кідаюцца з плошчы. Нечакана ім дарогу перагараджвае салдат са стрэльбай).

С а л д а т *(грозна)*. Стой на месцы!

(Дзед **Мікіта, Аслаў** і **Гараська** нямеюць, застываюць на месцы. Уваходзіць **Будан-Рыльскі**, суровы і грозны. За ім пад канвоем ідуць сяляне, нясуць крэслы, люстэрку, канапку, столікі, каўры і розныя рэчы панскага ўжытку. Трое салдат **Будан-Рыльскага** вядуць **Міхася, Дроба** і **Гузыра**. Ззаду на некаторай адлегласці, за імі ідуць жонкі і **Наста** з імі. Жанкі лемантуюць, прычытваюць. Чуюцца галасы: *„За што вы іх пабралі?“ „Куды вядзеце?“ „Разбойнікі!“ „З немцамі ваяваць не ўмелі, а з жанчынамі ды з безаружнымі дык вы хваты!“*)

Н а с т а. Міхаська, родны, за што цябе, што гэта робіцца?

Будан-Рыльскі. Маўчаць, хам'ё!

(**Гараська** ўбачыўшы бацьку пад канвоем, кідаецца да яго.)

Гараська. Тата! Татачка!

Будан-Рыльскі *(б'е Гараську нагайкай)*. Назад, шчанюк! *(Гараська з крыкам „а-яй-яй“ кідаецца наўцёкі.)*

Міхась *(не помнячы сябе)*. Не смей біць хлапчука!

Будан-Рыльскі. Хам разцуглены! Шпана большэвіцкая! З кім гаворыш? Рукі па швах!

Дзед Мікіта. Да што вы робіце? За што здзекуецеся, катуеце нас?

Будан-Рыльскі *(да дзеда Мікіты)*. Маўчаць, пудзіла старое! *(Афіцэру.)* Узяць гэтых дамарослых мудрацоў і ўсыпаць па пятнаццаць шомпалаў кожнаму. *(Афіцэр і двое белых салдат хватаюць Мікіту.)*

Дзед Мікіта *(адбіваецца)*. Смярдзюхі вы, чуй, дураньбраце, куды лезеце?

Бабка Тацяна. А паночак! А даражэнькі! Злітуйцеся! Куды-ж іх вядуць? Даруйце ім!

Будан-Рыльскі. А дзе-ж падбухторшчыкі?

Шышла. Вось яны *(Паказвае на Міхася, Гузыра і Дроба.)*

Будан-Рыльскі. А быццам-бы знаёмыя. Слаўныя воіны славутай дзевятай роты... Братальнічкі! Ух, вы морды! Я вамі зараз займуся!

Бабка Тацяна. А паночак, а даражэнькі. *(Бабы пачынаюць галасіць. Іх акружае канвой.)*

Будан-Рыльскі. Паслухалі большэвіцкіх агітатараў-горладзёраў, лодыраў: забірай, моў, панскае дабро, знішчай паноў. Вы думаеце, што мне шкада гэтага барахла. Да я плюю на яго *(б'е шабляй мэблю і ломіць яе)*. Я выб'ю гэтак-жа большэвіцкі дух з вашых галоў. *(У гэты час на званіцу шыбуе Гараська. Залазіць і звоніць. Заглушаючы шум, далятае глухі, надтрэснуты пажарны звон. Гукі яго нагадваюць словы: „гвалт! гвалт! гвалт!“ Будан-Рыльскі і яго салдаты палохаюцца. Сярод іх замінка.)*

Будан-Рыльскі *(у грозным тоне, хаваючы страх)*. Хто распарадзіўся падымаць трывогу?

Чыйся голас. Падпалілі нас! *(Агульны рух.)* Пажар! Ратуйце!

(Праз плошчу, як мага хутчэй, бяжыць салдат са стрэльбаю. Здалёк крычыць: *„Г. капітан, ратуйцеся: чырвоная гвардыя акружае нас!“* Кідае вінтоўку, на бягу скідае шынель, уцякае.)

Будан-Рыльскі *(пакідае ролю суддзі, адбягаецца на плошчу, падае каманду)*. Салдаты, ка мне! На коні!

(Дзесь за сялом зататакаў кулямёт. Сярод салдат Будана-Рыльскага паніка. **Канвойнікі** кідаюць арыштаваных. **Міхась** накідваецца на канвойніка, валіць на зямлю, вырывае вінтоўку. Агульная сумятня. Народ разбягаецца. **Поп** і **Бухрай**, якія назіралі экзекуцыю, хаваюцца. З розных краёў плошчы паказваюцца байцы, адзетыя як папала, у шынелях, у скураных куртках, з гранатамі за поясам і з кулямётнымі пасамі праз плячо. **Дзед Мікіта** падымаецца з зямлі, неда-

ўменна аглядаецца. Будан-Рыльскі, пакінуты сваімі салдатамі, пускаецца наўцёкі. За ім бяжыць Шышла, потым заварачвае ў другі бок. За сцэнаю голас: *„Стой, рукі ў гару“*. Чуваць стрэл з нагана. Валтузня, тукат людскіх ног. Голас: *„Марная твая справа, капітан!“*. Уваходзіць з ваяўнічым відам Патап, за ім, бледны, без шапкі і безаружны ідзе Будан-Рыльскі пад канвоем двух матросаў. На сцэне астаюцца Наста, бабка Таццяна, дзед Мікіта, Міхась, Аслаў, Дроб, Гузыр, збоку ціснецца натоўп мужчын і жанчын.)

Патап *(спыняецца, паказвае рукою на канапку)*. Прашу садзіцца, капітан! Здарова, брацішкі, дзядзькі і цёткі!

Голас. Да гэта-ж Патап Думака.

Міхась, Гузыр, Дроб *(разам)*. Патап! Родны! Браток! *(Акружаюць яго, радасна паціскаюць яму рукі.)*

Дзед Мікіта *(у радасным парыве)*. Збавіцелі нашы! *(Абнімае Патапа, выцірае вочы.)*

Бабка Таццяна. Што-ж гэта творыцца на свеце!

Наста. Божа-ж мой, што яны хацелі рабіць з намі!

Аслаў. За што? я пытаюся... Эх, Патапе, помню пытаўся ты: навошта поп і паліцэйскі стражнік?.. А навошта *(паказвае на Будан-Рыльскага)* азіят гэты?

Голас. Гэта ўсё адна хэўра.

Другі голас. Камень яму на шыю, ды ў букту!

Будан-Рыльскі. За маё ўніжэнне адкажаце перад законнаю ўладаю!

Дзед Мікіта. Ці бачылі, якая цаца! Маўчы, чуй, дураньбраце, бо вось зараз плясну табе ў морду!

Патап. Разбяромся, таварышы, па справядлівасці разбяромся

(Уваходзяць Алесь і Дзяменя. За імі чырвонагвардзейцы вядуць арыштаваных, сярод іх Шышла. Яго не заўважваюць. Ён загубіўся ў групе арыштаваных.)

Алесь *(зварочваецца да народу)*. Здарова, таварышы!

(Збіраецца натоўп народу.)

Галасы. Аляксандр Пятровіч!

Гараська. Настаўнік!

Гузыр. Прафесар!

Дроб. Наш настаўнік!

Дзед Мікіта. Кватарант мой! Родны ты мой, чуй, дураньбраце!

Алесь *(падыходзіць да Будан-Рыльскага. Цяжкая пауза.)* А запытайцеся, таварышы, гэтага бандыта, дзе наша настаўніца Марына Мікалаеўна?

Дзяменя. Адзін яе забойца злоўлен. Вось ён. Папаўся, каторы кусаўся! А дзе Шышла, што быў тут ураднікам?

Аслаў. Ён, сынку, яшчэ да рэвалюцыі знюхаў, чым вецер павявае і сышоў адгэтуль, як прусак перад пажарам.

(Шышла сядзіць ні жывы, ні мёртвы. Прыбягае Гараська, узрушаны і радасны.)

Гараська *(горда)*. А гэта я злётаў на званіцу ды ў пажарны звон лупянуў. Каб людзі збіраліся і ратавалі нас! Вось яны і прышлі! *(Смяецца радасным смехам.)*

Галасы. Маладзец, Гараська! Растаропны хлапец!

Матрос *(сурова)*. Што-ж мы, таварышы, тут будзем у пачэснай варце стаяць? Пара з імі канец рабіць.

Голас. Судзіць іх.

Гузыр. Які тут суд? Я яго, сукінага сына, яшчэ на пазіцыях на штык хацеў пасадзіць, ды вы, таварышы, утрымалі мяне... А шкода!

Дзед Мікіта. Бацюшка нам казаў: „якою мераю вы мерыце, такою адмераюць і вам". Вось трэба ім адмерыць так, як збіраліся яны, чуй, дурань-браце, адмерыць нам.

Голас. Правільна!

Патап. Мы, таварышы, салдаты рэвалюцыі, а суд—не наша чыннасць. Ёсць асобныя органы пролетарскай дыктатуры. Яны і будуць судзіць іх. Дык так, грамадзянін Будан-Рыльскі! Вы абяцалі пагаварыць з намі. Гаварылі мы на фронце, ды ўсяго не дагаварылі... Суда над вамі рабіць тут не будзем: у чэка аб вас сабраны матэрыял багаты.

Будан-Рыльскі. Прашу натацый мне не чытаць і не абражаць мяне!

Алесь *(з нянавісцю пазірае на яго)*. Хіба можна абразіць забойцу і бандыта?

Патап *(да матросаў)*. Вывядзіце яго адгэтуль, таварышы, каб не мазоліў нам вачэй, ды пільнуйце яго крэпка!

Голас. Тут-бы прыкончыць яго!

(Уваходзіць **Караліна**, апіраецца на доўгі кій, запыняецца, углядаецца ў людзей.)

Караліна. Колькі народу, людцы мае мілыя! Знаёмыя і незнаёмыя! *(Узіраецца ў Шышлу, заліваецца смехам.)* Ха-ха-ха. Паглядзеце-ж, які ён смешны!

Дзяменя. Хто, цётка, смешны?

Караліна. Ну, хто-ж? Ён—цар паліцэйскі. Быў белы, а зрабіўся шэранькі. І вусы астрыг. Думае, што так харашэй... Фацэція, ды годзі!

Дзяменя. Пакажы, пакажы нам, цётка, цара паліцэйскага!

Караліна. Баюся, міленькі! Ён-жа нагайкай біў мяне і шаблюю хацеў засеч... Унь ён! *(Паказвае на Шышлу.)*

Шышла *(змяніўся ў твары)*. Што ты клеплеш на мяне! Які я табе цар паліцэйскі, да, собственно, да?

Дзед Мікіта. Задакаў, чуй, дурань-браце! Да, гэта ён, Шышла дакала!

Міхась. А, дык вось яно што!.. А я глядзеў, адкуль ён мяне ведае.

Шышла. Вось сітуацыя!

Галасы. „Фараон"! „Ад'ютант Рыльскага!", „Спіскі падаваў яму!".

Дзяменя *(да Шышлы)*. А ну, дзядзька, пакажыся. Ён, ён! От прычапі яму толькі вусы, дык і цэлы Шышла.

Шышла. Гаспада таварышы! Я не Шышла, ей богу не Шышла! То быў другі Шышла. Я—Кандрашкевіч! Так і ў пасведчанні значыцца, да...

Дзяменя. Дагаварвай ужо—„собственно, да!“.

(Шышла дастае дакумент. Разам з дакументам няўмысля—вымае паперку, хапаецца, хоча схаваць яе.)

Дзяменя. Давай, давай! Усё паказвай. *(Забірае паперы, аддае Алесю.)*

Алесь *(разгортвае, чытае).* Спісак ліц сяла Загаруйкі, катория замешаны ў разграбленні маёнтка г. Будан-Рыльскага. Ты пісаў спісак?

Шышла *(бянтэжыцца).* Не... не я! Гэта поп! Гэта не я пісаў.

Алесь *(вымае з кішэні пакет, дастае лісток спісавай паперы, падносіць яго к шышлаваму носу).* Пазнаеш гэты дакумент—„яго высокаблагароддзю г. прыставу III стана“. Што-ж маўчыш? *(Зварачваецца да народу, падымае спісак і допіс прыставу.)* Таварышы! Адна рука, рука даношчыка, шпіёна, закаранелага ворага пісала і спісак гэты і гэты данос на мяне і на настаўніцу Марыну Мікалаеўну.

Шышла *(падае на калені).* Даруйце мне, таварышы!

Галасы абурэння. К сценцы яго! Застрэліць даносчыка. *(Шышлу вядуць пад канвоем.)*

Алесь. Вось, дакументы чалавечай пакуты, крыві і слёз! І гэта ўсё асталося мне на памяць аб самым блізкім для мяне чалавеку!.. Вось часцінка жудаснай аповесці пра барацьбу супроць нашай праўды. *(Пауза.)* Таварышы! Людзі, што жылі гэтай праўдай, часта гінулі за яе, але сама ідэя праўды жыве. Вайна за нашу волю, за наша шчасце не скончана, яна толькі пачынаецца.

Патап. Таварышы! Мы спыніліся тут не надоўга. Вы бачылі гэту банду? Нам вядома, што на поўдзень прабіраецца цэлы эшалон такіх-жа белых бандытаў. Мы павінны перасеч ім дарогу і абясшкодзіць іх, а вы, таварышы, памажыце нам. Для нас дораг кожны баец, кожны фунт хлеба... Які будзе ваш адказ, таварышы?

Бабка Тацяна. Ох, галубкі мае, ізноў вайна! Дык калі-ж ёй канец.

Голас. Ізноў мабілізацыя!.. Ох, ты, гора наша!

Міхась. Мабілізацыя? Ды яна наша, свая мабілізацыя!.. Сталі ўжо пад расстрэлам, ізноў паставяць, калі будзем сядзець ды на каго спадзявацца... Запішы мяне ў Чырвоную гвардыю!

Гузыр. І мяне пішы!

Дроб. А я што? Цяля ў бога ўкраў? Пішы, брат, і я з вамі!

Дзяменя *(падбягае да запісаўшыхся).* Браткі мае, арлы баявыя! Разам будзем крышыць белую костку! Завінемся, дык знай нашых!

Галасы знатоўпу. Запісвай!.. І мяне пішы! *(Настрой па-*

дымаецца. Чуюцца галасы: „Самі за сябе ваяваць будзем!“ „Смерць буржуям“.)

Гараська (*падыходзіць да Алеся*). І я хачу на вайну. Запішыце і мяне!

Дзед Мікіта. А з кім-жа я застануся? Ты-ж у нас цяпер адзін гаспадар дома, чуй, дурань-браце!

(На вуліцы чуваць гармонік. Ідзе Дроб, сабраны ў дарогу, з шынелем і з салдацкаю сумкаю. Праз плячо надзета салдацкая труба. Дроб іграе на гармоніку вясёлы матыў.)

Патап (*скідае шапку*). Таварышы, у паход! Камандзіры на мястах. Пратрубі, Паўлюк, збор! (*Паўлюк бярэ трубу, трубіць збор.*)

Дзед Мікіта. Эх, Аслаў, Аслаў, няма, адышла наша маладосць. Эх, старасць, а то і мы-б пайшлі здабываць сабе долю і вольнае жыццё.

(Чырвонагвардзейцы збіраюцца, строяцца ў калону. Калона рухаецца, ідзе: Алесь, Дзяменя, Патап, знімаюць шапкі, махаюць імі на развітанне. Галасы: *„Шчасліва заставацца!“ „Шчаслівай дарогі!“*)

Голас. Няхай жыве Чырвоная гвардыя!

ЗАПЯВАЛА. Рушым дружна грамадою
На паноў у свой паход,
Скончым з панскаю ардою
І адвечны знішчым гнёт!

ХОР. Эй, гарніст, іграй паход!
Дружна, армія, ўпярод!

(Жанчыны збягаюцца з сваіх хат, нясуць на дарогу салдатам ежу, бялізну ў клунках, а хто і так.)

Аслаў (*на паузе песні*). Праўда твая, Мікіта: чаму нам не па дваццаць гадоў?

ЗАПЯВАЛА. Разгарні ты, люд рабочы,
Сілу, волю ва ўсю шыр,
Зграі рознай патарочы
Улажы навек у жывр!

ХОР. (Усе заспявалі і пайшлі)
Эй, гарніст, іграй паход!
Смела, ратнічкі, упярод!

ЗАПЯВАЛА. Узнімайся, сцяг чырвоны,
Ды ўгары агнём шугай
І над светам паланёным,
Ясным сонцам заіграй!

ХОР. Эй, гарніст, іграй паход,
Дружна армія ўпярод!

Усё паступова аддаляючыся.

ЗАПЯВАЛА. Развязаў нам Ленін вочы,
Расказаў, дзе шчасце, мір.
Разгарніся-ж, люд рабочы,
Ва ўсю моц сваю і шыр!

ХОР. Эй, гарніст, іграй паход!
Грамада, валі ўпярод!..

Заслона.

Заслона апусцілася, але песня перадаецца яшчэ доўгі час, ізноў, па радыё громкагаварыцеля ў залу і ў карыдоры і ў выхадны вестыбюль і на вуліцу ўслед гледачам.

КАНЕЦ.

Дзяржаўная бібліятэка БССР

Рэдактар *Бутэлін*

Тэхрэдактар *І. Мілешка*
Карэктар *Адамовіч*

Здана ў друкаваню 23/X-37 г. Падпісана да друку 28/I-38 г. Абём $3^1/_4$ друкаваных аркуша. Папера $62\times94^1/_{16}$. Тыраж 2.000 экз. Зак. № 510. Уп. Галоўлітбела № 2588

Друкарня АН БССР.

ГПБ Ув.

N20 46/0

226

ЦАНА 3 руб. 50 к.

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ

Якуб Колас
ВОЙНА—ВОЙНЕ
Государственное
Издательство
Белоруссии
Минск — 1938

Дзяржаўная бібліятэка БССР
імені Леніна

B0000002725526